ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЛІПЕНЯ 2013 г. ЧАЦВЕР № 126 (27491) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Юлія Кадушкевіч: «Калі мы працавалі над спектаклем, дома я была проста невыноснай. А ўсё таму, што мая роля патрабавала канфліктнай сітуацыі». СТАР. 1

ЛІЧБА ДНЯ

Br129 трлн

у бягучых цэнах склаў аб'ём ВУП Беларусі за I квартал 2013 года, згодна з другой ацэнкай валавога ўнутранага прадукту. У параўнанні з I кварталам 2012 года ў супастаўных цэнах ён вырас на 3,8%. Раней ВУП краіны па выніках студзеня-сакавіка 2013 года складаў Br123,3 трлн, што на 3,5% больш у параўнанні з такім жа перыядам 2012 года. Гэта была папярэдняя ацэнка, якая грунтавалася на аператыўнай інфармацыі статыстычных абследаванняў, экспертных ацэнках і ўскосных разліках.

КАРАТКА

У Лідскім раёне Гродзенскай вобласці чатырохгадовая дзяўчынка выпала з 4-га паверха. Ноччу бацькі пайшлі на свята і пакінулі дачку, якая спала дома. Дзяўчынка паднялася з ложка і замест дзвярэй выйшла з пакоя праз адчыненае акно. На шчасце абышлося без цяжкіх траўмаў. Дарэчы, сям'я праблемнай не з'яўляецца.

Па выніках апытання хакейных спецыялістаў і беларускіх журналістаў, праведзенага спартыўнай газетай «Прессбол», найлепшым хакеістам Беларусі мінулага гульнявога сезона 2012/13 прызнаны Міхаіл Грабоўскі.

Насельніцтва Беларусі ў чэрвені ўпершыню за доўгі час купіла валюты больш, чым прадало. Фізічныя асобы за чэрвень прадалі наяўнай і безнаяўнай валюты на $619,1 млн у эквіваленце, набылі — $884,2 млн.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.07.2013 г.

Долар ЗША	8880,00	▲
Еўра	11370,00	▼
Рас. руб.	270,00	▲
Укр. грыўня	1088,90	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 21°
Віцебск	+ 27°
Гомель	+ 29°
Гродна	+ 26°
Магілёў	+ 29°
Мінск	+ 28°

ISSN 1990 - 763X

ХУТЧЭЙ НА «ПЯТРОВІЦУ»!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхар Любані Сяргей Выскварка і яго дачка Арына спяшаюцца на «Пятровіцу» — летнюю школу традыцыйных танцаў, якая праходзіць гэтымі днямі ў вёсцы Шыпілавічы. Шмат гадоў Сяргей загадвае арганізацыйна-творчым аддзелам Любанскага раённага Цэнтра культуры, з'яўляецца кіраўніком узорнага фальклорнага ансамбля «Верабейкі», у якім танцуе і яго 8-гадовая дачушка. Шыпілавіцкая танцавальная школа з рэгіянальнай перакрылася сёлета ў сапраўдны міжнародны пленэр, на якім майстар-класы па танцах даюць мясцовыя бабулі-доўгажыхаркі. СТАР 4

■ Соцыум

КОЛЬКІ НАС І ЯКІЯ МЫ?..

Да Сусветнага дня народанасельніцтва, які адзначаецца 11 ліпеня, Белстат падрыхтаваў статыстычны агляд па краіне. Колькі нас, які сярэдні ўзрост беларусаў, чаканая працягласць жыцця, колькі сярод нас гараджан, які рэгіён краіны з'яўляецца самым «маладым», а які — самым «старым», чытайце ў гэтым артыкуле.

Наша краіна па колькасці насельніцтва займае 89 месца ў свеце, 18 месца сярод еўрапейскіх дзяржаў, 5-е месца сярод краін СНД. У ёй пражывае ў 15 разоў менш чалавек, чым у Расіі, у 5 разоў менш, чым ва Украіне, але ў 1,5 раза больш, чым у Літве, Латвіі і Эстоніі, разам узятых. Прыкладна такую ж колькасць насельніцтва, як у нас, маюць Швецыя, Венгрыя, Партугалія, Чэхія.

Усяго колькасць насельніцтва Беларусі на пачатак 2013 склала 9 млн 464 тыс. чалавек.

Сярод абласцей больш за ўсё жыхароў мае Гомельская вобласць (1 427,7 тыс.), а сярод раёнаў — Барысаўскі (184,6 тыс.). Самым маленькім сярод гарадоў па колькасці насельніцтва з'яўляецца г. Дзісна ў Віцебскай вобласці (усяго 1,7 тыс. чалавек). СТАР 2

■ Мужчынская логіка

КУПЛЯЙЦЕ БЕЛАРУСКАЕ. А КАЛІ ПАТРЭБЕН ІНСТРУМЕНТ?

Даўно і многа пісалі пра адсутнасць на прылаўках беларускіх зубачыстак, пра завалле ў нашых крамах — дзяржаўных і прыватных — многіх такіх тавараў, што сорам не мець падобных сваіх: гэта і пластыкавыя кашпо, і драўляныя дошкі-лыжкі з-за акіяна для кухні, і невядомай якасці посуд, і «аднаразовыя» абутак і адзенне, і часта вельмі сумнеўнай якасці нават з-за паху дзіцячыя цацкі. Гэта — навідавоку, гэта ведаюць усе, але штодня патрэбны нейкія дробязі, мы купляем іх, асабліва не ўглядваючыся, адкуль яны і якой якасці.

ШТО МАЕМ — ТЫМ ГАНАРЫМСЯ

Добра, што маем уласныя якасныя прадукты харчавання, вопратку, халадзільнікі і пральныя машыны, сусветна вядомыя артыкулы вялікага экспарту... Параўнаць паліцы гастраномаў і гаспадарчых крам сярэдзіны 90-ых гадоў і сённяшнія проста немагчыма — хапае ўсяго на любы густ і на любую кішэню. Вядома, пакуль што легкавікі свае не робім, бананы і ананасы, кава і перац у нас, на жаль, таксама пакуль што не растуць, пры ўсіх поспехах нашых фармацэўтаў купляем у замежжы лекавая прэпараты. Увогуле, шмат чаго набываем, але гэта натуральна, бо ніводная краіна без імпарту не жыве.

Ёсць і яшчэ вялікая група тавараў, якія ў разрад стратэгічнага імпарту не ўваходзяць, але надта патрэбны ў кожным доме, кватэры і на кожнай дачы кожнаму мужчыне, у якога, як той казаў, рукі растуць з патрэбнага месца, — гэта інструменты. Рызыкну выглядаць нясціплым, але лічу сябе чалавекам умелым і маю ў арсенале добрых два-тры дзясяткі розных станочкаў і станкоў, многія дзясяткі дзедавых і бацькавых гэблікаў, калёвак, стругаў, склюдаў і сякерак... СТАР 3

ЧАС ЦУДОЎНЫХ АДКРЫЦЦЯЎ

Сёння афіцыйна стартуе XXII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Урачыстае адкрыццё фэсту №1 распачнецца ў Летнім амфітэатры ў 20.30. Гэтая галоўная сцэнічная пляцоўка «базару» сёлета, нагадаю, з'яўляецца юбілярам: амфітэатру — роўна 25 гадоў!

Учора ў рамках XI Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2013» выступілі, сярод іншых, і нашы зямлячкі, юныя беларускі Апалінарыя і Аляксандра Лакціёнава. Дзяўчынкам з Мінска па 11 гадоў, але ў іх ужо вельмі вялікі вопыт выступленняў на розных конкурсах і фэстах. СТАР 4

Фота БЕЛТА.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАВЕДАЕ КНР

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 15-17 ліпеня па запрашэнні Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна зробіць афіцыйны візіт у КНР. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Праграмай візіту запланаваны сустрэчы кіраўніка беларускай дзяржавы са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам, прэм'ерам Дзяржаўнага савета Лі Кэцянам і старшынёй Усекітайскага камітэта Народнага палітычнага кансультатыўнага савета Юй Чжэншэнам. У ходзе візіту плануецца падпісанне Сумеснай дэкларацыі і больш як 20 двухбаковых пагадненняў, пратаколаў і кантрактаў.

СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ Ў ЛІПЕНІ ДАКЛАДНА НЕ ЗМЕНІЦЦА

Стаўка рэфінансавання ў ліпені 2013 года застанецца на ранейшым узроўні — 23,5% гадавых, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка Беларусі.

Рашэнне аб гэтым прынята па выніках абмеркавання пытання на пасяджэнні праўлення Нацбанка 9 ліпеня. Дарэчы, у чэрвені прадоўжылася замаруджванне інфляцыйных працэсаў. Інфляцыя толькі 0,3%. «У той жа час сезоннае павышэнне попыту на замежную валюту з боку насельніцтва вызначае мэтазгоднасць захавання жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі, уключаючы дзейны ўзровень працэнтных ставак у эканоміцы, — тлумачаць у Нацбанку. — Пры гэтым падтрымліваюцца прывабныя ўмовы для зберажэнняў у беларускіх рублях».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ВЫТВОРЧАСЦЬ З ГІСТАРЫЧНЫМ КАЛАРЫТАМ

Мясцовыя ўлады прапанавалі буйным прадпрыемствам прывесці ў парадак пустуючыя дамы ў гістарычным цэнтры горада над Нёманам, а затым выкарыстаць іх у сваіх мэтах.

У прадпрыемстве «Гроднаэнерга» вырашылі паклапаціцца пра трохпавярховы будынак па вуліцы Карла Маркса. Ён быў пабудаваны прыкладна ў 1870 годзе, там была крама, цырульня і жыллё, аднак шэсць гадоў таму з-за аварыйнага стану людзей адтуль адсялілі. Пасля аднаўленчых работ энергетыкі маюць намер выкарыстаць гэты будынак для цэнтра апрацоўкі даных, зборачнай вытворчасці і праверкі прыбораў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

КОЛЬКІ НАС І ЯКІЯ МЫ?..

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У сярэднім на адным квадратным кіламетры тэрыторыі нашай краіны пражывае 46 жыхароў. Сярод рэгіёнаў найменш шчыльна населенай з'яўляецца Віцебская вобласць (30 чалавек на 1 кв. км), а ў Мінску гэты паказчык складае 5463 чалавека на 1 кв. км.

ТРЫ ЧВЭРЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА — ГАРАДЖАНЕ

Як і ў іншых краінах, у нашай рэспубліцы працягваецца працэс урбанізацыі. Так, за 2012 год колькасць гарадскога насельніцтва павялічылася на 45,9 тыс. чалавек і склала 7221 тыс. гараджан.

31 кастрычніка 2011 года колькасць насельніцтва Зямлі дасягнула 7 млрд чалавек

Найбольш хутка расце Мінск, насельніцтва якога за гэты перыяд павялічылася на 16 тыс. чалавек. Пасля Мінска найбольшы прырост адзначаны ў Гомелі — 7,3 тыс. чалавек, а найменшы ў Бабруйску — 605 чалавек. Прырост насельніцтва быў адзначаны таксама ў абласных цэнтрах і практычна ва ўсіх гарадах абласнога падпарадкавання.

Колькасць вяскоўцаў за 2012 год зменшылася на 47,3 тысячы чалавек. Усяго на пачатак 2013 года колькасць сельскага насельніцтва склала 2243 тыс. чалавек.

ЖАНЧЫН ПА-РАНЕЙШАМУ БОЛЬШ

У сярэднім па рэспубліцы на пачатак 2013 года на 1000 мужчын прыпадае 1152 жанчыны, у гарадской мясцовасці — 1166, у сельскай — 1109. Сярод гарадскога насельніцтва колькасць мужчын перавышае колькасць жанчын ва ўзросце да 28 гадоў, у сельскай мясцовасці — да 58 гадоў.

Найбольшая дыспрапорцыя мужчын і жанчын назіраецца ў сталым узросце. Колькасць жанчын ва ўзросце 60-69 гадоў на 1000 мужчын складае ў гарадах і гарадскіх пасёлках 1484, у сельскай мясцовасці — 1320. Ва ўзросце 70 гадоў і старэй колькасць жанчын перавышае колькасць мужчын у гарадской мясцовасці ў 2,3 раза, у сельскай — у 2,5 раза.

СЯРЭДНЯМУ БЕЛАРУСУ — ПАД СОРАК

Сярэдні ўзрост насельніцтва Беларусі 39,8 гадоў. Сярэдні ўзрост мужчыны 37 гадоў, жанчыны — 42,2 года. Для параўнання: сярэдні ўзрост жыхароў планеты складае 29 гадоў, Еўропы — 39,9 года.

Пачынаючы з 1990 года, сярэдні ўзрост насельніцтва рэспублікі павялічваўся. Кожнае дзесяцігоддзе сярэдні беларус становіцца старэй прыблізна на 1,8 года.

Сярэдні ўзрост гараджаніна — 38,5 года, за апошняе дзесяцігоддзе гарадскі жыхар «пасталеў» на 2,4 года. Сярэдні ўзрост сельскага жыхара — 44,1 года, і за апошняе дзесяцігоддзе вясковец стаў старэйшым на 1,5 года.

Сярэдні ўзрост насельніцтва абласцей адрозніваецца ад сярэдняга ўзросту насельніцтва па рэспубліцы. На працягу многіх гадоў самы «малады» рэгіён Беларусі — горад Мінск, сярэдні ўзрост насельніцтва якога склаў 38,1 года, наступным рэгіёнам з'яўляецца Брэсцкая вобласць — 39,5 года. Самы «стары» рэгіён — Віцебская вобласць (41,2 года).

КОЛЬКІ БУДЗЕМ ЖЫЦЬ?

Чаканая працягласць жыцця ў Беларусі супадае са сярэднесусветным значэннем, але значна саступае сярэднееўрапейскім паказчыкам.

У 2012 годзе чаканая працягласць жыцця склала 72,2 года, і ў параўнанні з 2011 годам павялічылася на 1,6 года. Гэта самы высокі ўзровень гэтага паказчыка больш чым за 20 гадоў.

Колькасць насельніцтва Беларусі на пачатак 2013 склала 9 млн 464 тыс. чалавек

У Беларусі па-ранейшаму назіраецца высокая розніца ў працягласці жыцця паміж мужчынамі і жанчынамі, у 2012 годзе яна склала 11 гадоў. Так, чаканая працягласць жыцця ў беларускіх мужчын — 66,6 года, у беларускіх жанчын — 77,6 года.

Калі параўноўваць: гэтыя паказчыкі з іншымі краінамі, то ў Японіі яны складаюць адпаведна 79,4 і 85,9 года, у Канадзе — 78,7 і 83,3 года, у Францыі — 78,4 і 85,1, у Італіі — 79,6 і 84,7, у Германіі — 78,4 і 83,2, у Вялікабрытаніі — 78,9 і 82,7, у ЗША — 76,3 і 81,1.

Затое наша краіна па чаканай працягласці жыцця апярэджвае Украіну і Расію: там гэтыя паказчыкі такія: 66 гадоў для мужчын і 75,9 года для жанчын (Украіна), і 64 і 75,6 года адпаведна ў Расіі.

Святлана БУСЬКО

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Цяпер можна будзе паляваць і з лукам?

Летне-асенні сезон палявання на вадаплаўную і балотную дзічыну ў Беларусі традыцыйна адкрываецца ў другую суботу ліпеня і доўжыцца да другой нядзелі снежня. Сёлета ён пачнецца 13 ліпеня. Пра асаблівасці нацыянальнага палявання расказаў старшыня рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» Юрый Шумскі падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БелТА. «Звязда» друкуе найбольш цікавую і карысную інфармацыю, агучаную на гэтай канферэнцыі.

ТРАПІЎ У БАКАСА — СНАЙПЕР

«Праўда, з 13 ліпеня будзе дазволена паляваць толькі на бакаса і толькі ўладальнікам так званых падружэйных сабак, — кажа Юрый Шумскі. — Да іх залічваюцца выжлы, спаніэлі і рэтрыверы. Нягледзячы на зусім сціплыя памеры самога аб'екта палявання (бакас важыць 100-150 г), здабыча яго лічыцца вельмі прэстыжнай сярод паляўнічых. Дарэчы, па-англійску бакас завецца «snipe», адсюль і слова «снайпер», гэта значыць той, хто здабыў бакаса». Асноўны ж сезон палявання на астатнюю вадаплаўную, балотную дзічыну, прадстаўнікоў палявой і баравой дзічыны адкрыецца з 10 жніўня. «Адкрыццё гэтага сезона традыцыйна прыцягвае большасць нашых паляўнічых, бо менавіта з палявання на качку многія і пачыналі свой паляўнічы шлях. Пазней, з верасня, адкрыецца сезон палявання на рабчыка, шэрую курапатку і гусей».

НЕНАЎМЫСНАЯ ЗДАБЫЧА — ТАКСАМА НЕЗАКОННА

«Адказнасць за ненаўмысную здабычу птушкі, якая не адносіцца да пераліку паляўнічых жывёл, будзе зроблена больш мяккай толькі ў выпадку фактычна пацверджаных змякчальных абставін, якія будзе аналізаваць суд. За незаконную здабычу лебедзя-шыпуна, напрыклад, сёння ў адпаведнасці з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання прадугледжаны штраф у памеры 10 базавых велічынь», — расказаў спецыяліст.

ЧАС СКАРОЦІЦЦА, АЛЕ АДСТРЭЛЬВАЦЬ БУДУЦЬ БОЛЬШ

Юрый Шумскі заявіў, што «цяпер у паляўнічых угоддзях БТПР увесну дазволена паляванне на пралётных гусей і качараў крыжанкі. Сезон палявання на гусей доўжыцца каля двух месяцаў, на крыжанку — каля паўтара. У новай рэдакцыі Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання прадугледжана пашырэнне спіса дазволеных вясной да адстрэлу відаў качак, а таксама скарачэнне агульнай працягласці сезона палявання на качак і гусей да чатырох тыдняў».

ЯК СТАЦЬ САПРАЎДНЫМ ПАЛЯЎНІЧЫМ?

«Перш чым стаць членам таварыства паляўнічы, як правіла, здае спецыяльныя іспыты на атрыманне дзяржпасведчання на права палявання, у выніку падрыхтоўкі да якога ён вывучае не толькі Правілы вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, але і асновы біялогіі звяроў і птушак, пытанні паляўнічай этыкі, — расказвае Юрый Шумскі. — Таму тыя, хто прыходзяць па паляўнічую пуцёўку, маюць неабходны багаж ведаў. Адным з асноўных патрабаванняў пры выдачы паляўнічай пуцёўкі з'яўляецца адсутнасць у паляўнічага парушэнняў Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання. Зараз падрыхтоўка да здачы спецыяльнага паляўнічага экзамену можа ажыццяўляцца грамадзянамі на добраахвотнай аснове, самастойна. У праекце новай рэдакцыі Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання прадугледжана распрацоўка парадку здачы спецыяльнага паляўнічага экзамену, адным з патрабаванняў якога будзе абавязковае навучанне грамадзян. Да таго ж сёння ў нашых раённых і абласных арганізацыйных структурах кандыдатам аказваецца тэарэтычная дапамога ў здачы іспытаў».

ЭКЗАМЕН ПА СТРАЛЬБЕ

Для паляўнічых хочуць увесці абавязковы экзамен па стральбе. Таварыства паляўнічых і рыбаловаў ставіцца да гэтага новаўвядзення станоўча, «бо павышэнне ўзроўню стралковай падрыхтоўкі паляўнічых дапаможа знізіць колькасць падранкаў на паляванні. Неабходна толькі для гэтага прывесці ў адпаведнасць заканадаўчую базу».

ПАЛЯЎНІЧЫЯ ДАПАМОГУЦЬ У БАРАЦЬБЕ З АФРЫКАНСКАЙ ЧУМОЙ

Юрый Шумскі адзначыў, што «ў сувязі з успышкамі афрыканскай чумы свінняў для прадухілення яе распаўсюджвання прынята рашэнне на ўзроўні ўрада аб памяншэнні кошту палявання на дзіка для максімальнага скарачэння яго колькасці».

ЯК АТРЫМАЦЬ ПАЛЯЎНІЧУЮ ЗБРОЮ?

«Рэгістрацыяй паляўнічай зброі займаюцца органы МУС. Для набыцця спачатку неабходна атрымаць у органах МУС па месцы рэгістрацыі часовы дазвол на набыццё паляўнічай зброі. Для яго атрымання вам неабходна быць паляўнічым і мець дзяржаўнае пасведчанне на права палявання. Пасля набыцця зброю трэба зарэгістраваць у органах МУС і атрымаць дазвол на нашэнне і захоўванне паляўнічай зброі. Захоўванне зарэгістраванай зброі павінна ажыццяўляцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі закона Рэспублікі Беларусь аб зброі. Для атрымання больш дэталёвай інфармацыі вам неабходна звярнуцца ў органы МУС», — патлумачыў спецыяліст.

АДРАДЖЭННЕ ДНЯ РЫБАКА І ЛАЯЛЬНЫЯ ПРАВІЛЫ

На бліжэйшым пленуме, які адбудзецца 11 ліпеня 2013 года, таварыства паляўнічых і рыбаловаў, па словах Юрыя Шумскага, плануе ўнесці прапанову аб адраджэнні Дня рыбака.

Яшчэ адна прыемная навіна — новыя правілы палявання, якія цяпер знаходзяцца ў стадыі абмеркавання, больш лаяльныя ў дачыненні да паляўнічых: павялічана колькасць птушынай дзічыны, на якую можна будзе паляваць. «У той жа час абмяркоўваецца ўзмацненне жорсткасці захадаў у дачыненні да парушальнікаў правілаў палявання, каб, згодна з заканадаўствам, прыцягнуць да адказнасці тых, хто незаконна палюе. Прыватных паляўнічых гэтыя ўзмацненні жорсткасці не закрануць».

ПАЛЯВАННЕ З ЛУКАМ

Адказваючы на адно з пытанняў, Юрый Шумскі паведаміў, што, паводле дзейных правілаў, паляванне з лукам не дазволена. «Але ў правілах, праект якіх цяпер падрыхтаваны, уведзена норма, што дазваляе паляваць з лукам на тэрыторыі Беларусі. Калі новыя правілы будуць прыняты ў той рэдакцыі, якая падрыхтавана, то гэтая норма будзе дзейнічаць».

БЕЛАРУСЫ ПАЧНУЦЬ ЕСЦІ БАБРОЎ?

«Так, дзейнасць баброў стала ствараць у апошні час шмат праблем для работнікаў дарожнага будаўніцтва, лясной і сельскай гаспадаркі, — згадзіўся з існаваннем праблемы старшыня таварыства паляўнічых і рыбаловаў. — З мэтай мінімізацыі шкоды распрацаваны і выконваецца ўсімі паляўнічымі гаспадаркамі план мерапрыемстваў па зніжэнні шкоды, якая прычыняецца бабрамі. У плане, зацверджаным намеснікам прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, прадугледжваюцца мерапрыемствы па вывучэнні папуляцыі бабра ў краіне, мерах па яе канфіскацыі і да т.п. Цяпер усім паляўнічым дазволена паляванне на бабра, і ў гэтым годзе мы будзем агітаваць іх рабіць гэта ўсімі законнымі спосабамі. Акрамя таго, у новай рэдакцыі Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання падоўжаны тэрмін палявання на бабра. Што да прамысловага выкарыстання бабра, сёння сумесна з Белдзяржхарчпрамам прапрацоўваецца пытанне аб выкарыстанні мяса бабра ў харчовых мэтах».

Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

■ Шпацыр па Камароўцы

ПА АБРЫКОСЫ — ЧЭРГІ, А СУНІЦЫ СТАВЯЦЬ КОШТАВЫЯ РЭКОРДЫ

Лета прыносіць на Камароўку ўсё больш свежай гародніны-садавіны. Закупіцца прапануюць не толькі заморскім, але і беларускім, таксама смачным і апетытным. Але калі этыкетка сведчыць пра «айчыннае» паходжанне, то кошт — не заўжды...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

... Выбіраю прылавак з самай «сімпатычнай» чарэшняй і прыпыняюся ля яго. На цэнніку пазначана — «Узбекістан», каштуе смакоцце 28 тысяч за кілаграм. Ягады вельмі салодкія, смачныя, але і вельмі спелыя: калі ўзяць з паўкілаграма і з'есці ў гэты ж дзень — яшчэ нічога, а вось да заўтра, а тым больш да паслязаўтра такія ягады наўрад ці «дажывуць».

— Вазьміце лепей гэтыя, па 30 тысяч. Яны пастаяць даўжэй, — раіць прадавец.

Вырашаю знайсці чарэшню, прывабную і па кошце, і па якасці. Пару хвілін у рынкавым натоўпе — і вось яно! Я хуценька накіроўваюся да цэнніка ў 26 тысяч і пачынаю прыглядацца да ягад. Чарэшня гэтая не такая спелая, як на першым прылаўку, дзе-нідзе трапляюцца зеленаватыя ягады. І самае галоўнае — чарэшня беларуская. Вось чаго ўжо не чакала. На смак ягады аказваюцца кіславатымі, але тут, як той казаў, кожнаму сваё. Вось толькі кошт... Я не спецыяліст у садаводстве, цэнаўтварэнні ці грузаперавозках, таму, відаць, не разумею, як чарэшня з беларускага саду, якую дастаткова вечарам сабраць, а раніцай адвезці на рынак, каштуе амаль такіх жа грошай, што і ягады, прывезеныя з-за тысячы кіламетраў. Яны ўвесь час, пакуль ехалі на беларускі рынак, патрабавалі правільнага захоўвання, а яшчэ — узбекская чарэшня больш салодкая. Для пакупнікоў, здаецца, выбар відавочны.

Лічыльнік «Звязды»
(кошты за кілаграм, калі не пазначана іншае):
Агуркі — 5,9—7,5 тысячы
Памідоры — 13—86 тысяч
Кроп, пятрушка — 4—5 тысяч (за 100 г)
Бульба — 8—13 тысяч
Кабачкі — 6—8 тысяч
Баклажаны — 6,5 тысячы
Морква новага ўраджаю — 16 тысяч
Персікі — 23—30 тысяч
Клубніцы — 20 тысяч
Апельсіны — 14—18 тысяч
Лімоны — 10—15 тысяч
Грэйпфрут—26 тысяч
Яблыкі — 11—25 тысяч
Бананы — 11 тысяч
Слівы — 18 тысяч

Да таго ж пачаставацца іншымі ягадамі, напрыклад, кавунамі, таксама ўжо можна па досыць прывабным кошце. За кілаграм на Камароўцы просяць 8 тысяч рублёў. А вось дыні зусім не танныя. Кілаграм каштуе ад 20 да 25 тысяч рублёў.

На рынку сапраўдныя чэргі па абрыкосы. Прычым бяруць не па кілаграму, а прыходзяць з вёдрамі і кошыкамі. Захацеўшы набыць сабе трохі і пакаштаваць, я мусіла адстаяць чаргу. Прадавец выграбла са скрыні апошняе. Людзям, што займалі чаргу за мной, відавочна, не пашанцавала. Самыя дробныя абрыкосы можна набыць, заплаціўшы 14 тысяч за кілаграм. Як сказала адна з жанчын у чарзе, «на варэнне пойдуць». Крыху большыя і саладзейшыя каштуюць 18 — 22 тысячы. Варта толькі ўважліва выбіраць абрыкосы па такім кошце, бо на некаторых прылаўках трапляюцца надта мяккія і з прымятымі бакамі. А самыя дарагія абрыкосы, па 30 тысяч за кілаграм — гэта ідэальны баланс знешняга выгляду і смаку.

Садовыя маліны знайсці на рынку зараз можна ў вялікай колькасці. Тым не менш кошт зусім не сімвалічны. За кілаграм просяць 40 тысяч. Кілаграм чорных парэчак можна набыць за 27 тысяч рублёў. Прадаюць і зялёны агрэст. Кілаграм абыдзецца ў 35 тысяч.

Лясныя ягады і грыбы радуюць сваёй колькасцю, але ля прылаўкаў чэргаў не заўважыш.

— Пакуль што людзі ў асноўным купляюць максімум па тры літры: паесці ці варэнікі зрабіць. Кошт яшчэ не самы нізкі, — падзялілася назіраннямі прадавец чарніц. Іх на Камароўцы можна набыць, заплаціўшы ад 32 да 33 тысяч рублёў за кілаграм.

Жанчына, што гандлявала па суседстве, амаль схавалася за гарой лісічак, насыпаных на прылавак. Дробныя жоўтыя грыбкі, надзвычай смачныя, калі пасмажыць іх разам з бульбай, не кожны сабе зможа дазволіць для летняй вячэры. Кілаграм — ажно 70 тысяч. Акрамя лісічак, на прылаўку знайшліся буякі. За паўлітровы слоік трэба было заплаціць 20 тысяч рублёў. Суніцы, сезон якіх ідзе да завяршэння, яшчэ прадаюцца, але яны ў асноўным не надта прывабнага выгляду і дарагія: 40- 50 тысяч за паўлітра.

Думалася, што гэта будзе апошнім «коштавым» здзіўленнем і рэкордам, пакуль не прыйшла да латка з рознай экзотыкай: авакада, манга... Сярод гэткіх дзівосаў нейкім чынам аказаліся звычайныя на выгляд памідоры. Толькі вось кошт у іх незвычайны — 86 тысяч за кілаграм. Я пацікавілася, ці не напісала прадавец лішні нуль на цэннік, але ў адказ на мяне толькі падазрона паглядзелі.

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■

КУПЛЯЙЦЕ БЕЛАРУСКАЕ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі зараз пры іх набыцці кіравацца лозунгам «Купляйце беларускае!», дык можна застацца толькі з малатком, сякерай ды наждаком. Выключэнне — хіба што цудоўны шматфункцыянальны магілёўскі дрэваапрацоўчы цэнтр. А электрадрылі, перфаратары і штрабарэзы, лобзікі і вуглашліфавальныя «балгаркі», сабельныя, тарцовачныя і лентачныя пілы, такарныя станкі па дрэве, пліткарэзы, бытавыя кампрэсары для мыцця аўто, дахаў і для рознага тыпу фарбавання, трымеры і бензакосы — гэта ўсё завазное. У крамах яны даражэй, праз інтэрнэт — куды танней і без клопату, бо прывязуць на адрас у зручны час, навучаць карыстацца, дадуць чэк і гарантыю абслугоўвання. Магчыма, веласіпед вынаходзіць і не заўсёды варта, але адсутнасць бытавых беларускіх інструментаў асабіста ў мяне закранае нацыянальнае пачуццё гонару. Робім жа дзесяцігоддзямі касмічную тэхніку, аўтамабілі і трактары, электроніку, славутыя на ўвесь свет сваёй оптыкай і лазерамі, а электралобзіка не зробім. Чаму? Магчыма, скажа нехта, рынак бытавых электраінструментаў у краіне ўжо перанасычаны і таму страчаны? Гэта як паглядзець...

ШАНЦ ЁСЦЬ: «ЦУДА-ПІЛА»

Падставай для гэтай заметкі стала набыццё бытавой стужачнай пілы — маёй даўняй мары. Цудоўны апарат: кампактны, няцяжкі — кілаграмаў пад 30, шуму — як ад жончынага фена, а пілуе — хочаш сабе і прама, і як лобзік, і наўскос, а па таўшчыні — ад некалькіх міліметраў да дзесяці сантыметраў, і пылу амаль няма, бо палатно — танюсенькае. Пілуй сабе хоць на балконе — сусед і ноччу не пачуе. І работа на ёй куды бяспечней, чым на звыклай «цыркулярцы». Дарэчы, у Амерыцы і Заходняй Еўропе многія майстры, лісты якіх рэгулярна чытаю, ужо гадоў 20-30 «цыркулярныя» амаль не выкарыстоўваюць: як вядома, яны даражэйшыя, «ядуць» куды больш электрычнасці, страшэнна шумныя і невыносна пыльныя. Але штука гэтая — бытавая стужачная піла — у нашых прафесіяналаў і аматараў пакуль слаба вядомая. Мой набытак, дарэчы, даволі вядомай расійскай маркі, але зроблены ў КНР.

Нехта мне запярэчыць: навошта нам сваё выдумляць, калі на рынках прадаецца інструмент славутых брэндаў? Дык, па-першае, амаль што ўсе «славутыя брэнды», якія прадаюцца ў нас, у асноўным збіраюцца ў краінах з самай таннай рабочай сілай, а ўзровень кваліфікацыі добрага беларускага майстра на шэсць галоў вышэй...

Падобных тавараў у інтэрнэт-крамах можна знайсці вялікае мноства, толькі выключна ад замежных фірмаў — ад Тайваня да Швейцарыі і Швецыі. А складаецца мая піла з рухавіка ўсяго на 350 Вт, стужкі-пілы, якая бегае па двух колах, трох-чатырох рэгуліровачных шрубах і невялікага рухомага рабочага стала з алюмініевага сплаву... Вось вам і ўвесь апарат. Каштуе крыху больш за 3 мільёны. Дарэчы, яшчэ ў старых савецкіх падручніках па дрэваапрацоўцы выдання 30-40-х гадоў мінулага стагоддзя такія пілы ўзгадваюцца часта... Разабраўшы і агледзеўшы — здзівішся, якая простая рэч. Рызыкну сказаць, што ніхто з нашых станкабудаўнікоў такую пілу, мусіць, і ў вочы не бачыў. А інакш — чаму айчынных такіх няма? Але, як толькі сталі пастаўляцца да нас такія пілы новымі, прадпрымальныя людзі адкрылі ў сталіцы яшчэ і краму, дзе можна набыць інструмент, якім нехта за мяжой колькі гадоў пакарыстаўся. І купляюць людзі: кошты ж смешныя, нават чарга ёсць... Былі б свае такія — упэўнены, разбіралі б пры добрай рэкламе не горш, чым зараз імпартныя электрадрылі і бензакосы... Але будзем аптымістамі і пачакаем, бо ў той інтэрнэт-краме, дзе я набыў сваю пілу, спецыялісты мне сказалі, што попыт расце, умельцы ўваходзяць у смак, але вось ці скарыстаецца з гэтага наша прамысловасць?

Той самы штрабарэз.

Нехта мне запярэчыць: навошта нам сваё выдумляць, калі на рынках прадаецца інструмент славутых брэндаў? Дык, па-першае, амаль што ўсе «славутыя брэнды», якія прадаюцца ў нас, у асноўным збіраюцца ў краінах з самай таннай рабочай сілай, а ўзровень кваліфікацыі добрага беларускага майстра на шэсць галоў вышэй, у чым я ўпэўніўся, здаючы ў рамонт гэтыя «славутыя брэнды»... Па-другое, а чаму б, выпускаючы ўласны электраінструмент, не рабіць яго пад маркай сапраўды славутых БелАЗа, «Амкадора» і ім падобных? Гэта не камень у агарод памянёных марак, а падстава задумацца, бо часта навязлівая, агрэсіўная рэклама бензакасы вытворчасці фірмы, скажам, «Тры званочкі», уводзіць у зман недасведчанага чалавека. А робіцца гэты інструмент найчасцей «на калене ў падвале».

ПРА АДНАГО ПРЫХІЛЬНІКА НАШЫХ ТАВАРАЎ

Мы разважалі пра якасныя станкі і інструменты — рэчы тэхнічна даволі-такі складаныя, для вырабу якіх патрэбна адпаведная вытворчасць з кваліфікаванымі рабочымі, якаснымі матэрыяламі, камплектуючымі і кантролем якасці.

А чаму такая процьма ў нашых крамах імпартных, у большасці аднаразовых, мужчынскіх шкарпэтак? Тавар капеечны, а знайсці якасныя айчынныя — дык і пашукаць яшчэ трэба. Тут дарэчы захацелася прыгадаць выпадак, які здарыўся з дыпламатычным прадстаўніком адной еўрапейскай краіны ў Расіі колькі гадоў таму — пра гэта нават гаварылі ў прэсе. У даволі вялікім рангу дыпламат рэгулярна наведваўся з Масквы ў Мінск і, маючы дыпламатычную недатыкальнасць, скрынямі вывозіў з Беларусі нашы панчошна-шкарпэткавыя вырабы, якія сам і здаваў у маскоўскія крамы і на базары. Нейкім чынам бізнес гэты прыкрылі, а «гандляра» расійскае МЗС папрасіла пакінуць краіну. Магчыма, зараз ён шые плюшавыя цацкі... Што ўсцешыла мой беларускі гонар у гэтай гісторыі — чалавек выконваў лозунг «Купляйце беларускае!»

Пятро РАМАНЧУК.

■ На слыху

СКРАЎ ВЕЛАСІПЕД, СТЫЛІЗАВАНЫ ПАД МАТАЦЫКЛ

Супрацоўнікі Першамайскага РУУС сталіцы затрымалі 31-гадовага непрацуючага мінчаніна, які скраў веласіпед, стылізаваны пад рарытэтны матацыкл.

«Грамадзянін праходзіў каля аднаго з дамоў па Лагойскім тракце і заўважыў двухколавы транспартны сродак, што стаяў на балконе пажарнай лесвіцы. Тут жа з'явілася думка «прыхватызаваць» веласіпед, стылізаваны пад матацыкл 1970-1980-х гадоў, — расказала **прэс-сакратар Першамайскага РУУС г. Мінска Вольга КУЦЬКО.** — Дачакаўшыся, пакуль жыхары будуць вяртацца дадому пасля працы, зламыснік пад выглядам госця трапіў услед за імі ўсярэдзіну і скраў веласіпед. Транспартны сродак грамадзянін прадаў у той жа дзень за 50 долараў».

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ
Государственное производственное объединение «Минскстрой»
доводит до сведения заинтересованных лиц
О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ
о строительстве жилых помещений объекта **«Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 17 по генплану»** в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 7 июня 2012 года:

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений № 8, № 26, № 29, № 106, № 114, № 115, № 118, № 120, № 126, № 135, № 140, № 146, № 149 без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет – 12 418 779 руб. – на 1-комнатные квартиры; 11 757 442 руб. – на 2- комнатные квартиры; 11 096 105 – на 3-комнатные квартиры.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) и договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул.К.Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию. УНП 100071325

У суд Першамайскага раёна г. Мінска паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **Куліковай Юліі Мікалаеўны,** 13 лютага 1982 года нараджэння, якая пражывала па адрасе: г. Мінск, вул. Калініна, д. 26, кв. 40.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асоб паведаміць суду Першамайскага раёна г. Мінска (вул. Талбухіна, 9-20) на працягу двух месяцаў вядомыя звесткі пра **Кулікову Юлію Мікалаеўну.**

Считать недействительными страховые полисы СООО «Белкоопстрах» по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВР № 0612821, 0612822; квитанция о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии КС № 3921047. УНП 100706519

ХУТЧЭЙ НА «ПЯТРОВІЦУ»!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Час праваслаўнага Пятроўскага посту на Любаншчыне называюць Пятровіцай. А само свята завецца «Пятрок». За тыдзень перад ім ладзіцца Купалле. Таму не памылімся, сказаўшы, што адно свята пераходзіць у другое, што ад Купалля да Пятра ўсяго паўкрока.

Традыцыйна ў гэты летні перыяд вясковыя жанчыны збіралі лекавыя зёлкі, рыхтаваліся да блізкага жніва, спявалі купальскія і пятроўскія песні, якія часта нават не адрозніваюцца. Час прыгожай прыроды і багатай разнастайнасці традыцый і звычаяў. А ўжо песень, гульняў, танцаў! Менавіта на Пятровіцу работнікі культуры Любаншчыны ўжо трэці год запар ладзяць своеасаблівы пленэр — летнюю школу традыцыйнага танца «Пятровіца». У вёску Шыпілавічы прыехалі студэнты факультэта этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, іншая моладзь, якая імкнецца вывучаць і захоўваць беларускі фальклор. Адгукнуліся на запрашэнне пазнаёміцца з нашай народнай культурай госці з Літвы і Расіі. Наогул удзел у гэтым культуралагічным праекце сёлета бяруць каля 60 чалавек. Ля купальскага вогнішча на беразе Арэсы і пачалася гэтая незвычайная моладзевая школа, мэта якой — навучыцца рэгіянальным танцам і правесці шэраг экспедыцый па вёсках у пошуках крыніц традыцыйнай народнай культуры Любаншчыны.

Куратар рэгіянальнага, а па сутнасці, міжнароднага праекта — фальклярыст, **кіраўнік узорнага фальклорнага ансамбля «Верабейкі» Сяргей ВЫСКВАРКА** кажа: «Таксама адна з мэт школы навучыцца адпачываць традыцыйна, па-беларуску, без камп'ютараў і тэлевізараў, а з песнямі, танцамі, гульнямі».

Што цікава, некалькі беларускіх сем'яў замест адпачынку ў Турцыі і Егіпце вырашылі правесці свой адпачынак менавіта ў вёсцы Шыпілавічы.

Фіналам гэтай школы стане рэканструкцыя народнага абрада «Пятрок», які бытуе на Любаншчыне з даўніх часоў.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.
Любанскі раён.

ЧАС ЦУДОЎНЫХ АДКРЫЦЦЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Апалінарыя, напрыклад, у 2011 годзе атрымала званне лаўрэата III ступені Міжнароднага фестывалю дзіцячай творчасці «Залатая пчолка». Летась стала лаўрэатам I ступені першага адкрытага конкурсу мастацтваў «Ззянне талентаў». У студзені бягучага года заваявала Гран-пры Міжнароднага моладзевага конкурсу-фестывалю вакальнага, харэаграфічнага і цыркавога мастацтваў «Брыльянт Карпат» (Украіна)...

Аляксандра — выхаванка Нацыянальнага цэнтра музычнага мастацтва імя Уладзіміра Мулявіна пад кіраўніцтвам Святланы Стацэнка. Дзяўчынка — пераможца рэспубліканскага тэлевізійнага дзіцячага конкурсу «Я спяваю», лаўрэат I ступені XIV адкрытага конкурсу выканаўцаў новай дзіцячай песні «Дзень нараджэння», VII Міжнароднага фестывалю юных талентаў «Зямля пад белымі крыламі», Міжнароднага фестывалю эстраднай творчасці «Музычная карусель Санкт-Пецярбурга — 2012» і гэтак далей. Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з дзяўчынкамі.

— Мне на «базары» ўсё вельмі спадабалася, тут усё так цікава, — кажа **Апалінарыя**. — Была на розных конкурсах, але такога яшчэ не бачыла нідзе — ні ва Украіне, ні ў Азербайджане. Мне здаецца, наша Беларусь — самая лепшая краіна. Што да конкурсу, то ў мяне ёсць прыкмета: калі забалела горла, значыць, усё будзе вельмі добра. І горла забалела!

Аляксандра расказала, што яе талісманы — залаты анёлак і ключык, якіх яна носіць на шыі на ланцужку. Прыехала ў Віцебск з мамай і кіраўніком цэнтра музычнага мастацтва. Раней глядзела фестываль па тэлевізары.

— Пакуль няма ў мяне ўлюбёнага месца ў Віцебску. Унутранае хваляванне перад выступленнямі, безумоўна, ёсць, а так наогул не хвалююся. Проста забываю пра гэта, — прызналася Саша.

Сёлета **Аляксандр ЦІХАНОВІЧ, народны артыст Беларусі, узначальвае журы конкурсу.**

— Дзеці — заўсёды спецыфіка, вельмі складана і адказна судзіць творчасць дзяцей. Таму нам, членам журы, трэба будзе самім на нейкі час стаць дзецьмі. Без гэтага, думаю, немагчыма правільна ацэньваць выступленні юных канкурсантаў. Бадай кожны з членаў журы за плячыма мае вялікі вопыт выступаў, удзелу ў журы розных конкурсаў. Думаю, мы зможам аддаць сваю любоў і цеплыню кожнаму ўдзельніку, — сказаў ён.

Артыст з вялікай цеплынёй выказаўся пра юбілей Летняга амфітэатра: «Сёлета роўна 25 гадоў амфітэатру. Вы ведаеце, мне пашчасціла, што я бачу ўсе пераўтварэнні ў ім. Яшчэ з конкурсу польскай песні і да сённяшняга дня. І хочацца падзякаваць ад душы чалавеку, які шмат зрабіў для «базару» і амфітэатра — я пра былога дырэктара фэсту Радзівона Баса. Хацелася б, каб мы памяталі пра гэта і дзякавалі гэтаму чалавеку за прафесіяналізм, самаадданасць і любоў да мастацтва. Ён вельмі сумленны і сапраўдны служыцель мастацтва.

Папулярны спявак Яўген ГОР сказаў, што ён упершыню з'яўляецца членам журы.

— Не сплю ўжо двое сутак. І не магу ўсвядоміць тое, што адбываецца: дзятвы куча, усё хадуном ходзіць, усё каляровае... Тут вельмі крута ўсё. Спадзяюся, адкрыю для сябе новыя імёны, — расказаў ён карэспандэнту «Звязды».

Я пацікавіўся ў спевака: ці паўплываў яго ўдзел у конкурсе «базару» ў 2004 годзе на ўласны творчы лёс?

— Вядома. І гэта быў адпраўны пункт майго творчага развіцця. Усё пачалося адсюль. Але, напэўна, нават не з «базару», а з конкурсу ў Магілёве — «Залаты шлягер». Ён яшчэ праходзіць да гэтага часу? Добра. Памятаю, я тады я прыехаў на першы такога ўзроўню міжнародны конкурс. І тады я атрымаў прыз глядацкіх сімпатый: уся Беларусь прагаласавала за мяне. А «базар» ужо паставіў канчатковую кропку, і для мяне сталі адкрытыя многія дарогі...

Гран-пры конкурсу — 5 тысяч долараў, 1-я прэмія — 3 тысячы долараў, 2-я прэмія — 2 тысячы долараў, 3-я прэмія — 1 тысяча ўмоўных адзінак.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Адпачынак-2013

Падрыхтоўку пляжаў замарудзіла паводка

Пра гэта ў Нацыянальным прэс-цэнтры паведаміла загадчык аддзялення камунальнай гігіены Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына Жаўняк падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай дзяржаўнаму санітарнаму нагляду за ўтрыманнем зон рэкрэацыі.

«З 28 чэрвеня па 4 ліпеня была даследавана 391 зона адпачынку, на 43 з іх (гэта 11%) выяўлены парушэнні санітарных нормаў, правілаў і гігіенічных нарматываў», — расказала Ірына Жаўняк. Пры гэтым яна адзначыла, што даследаванні праводзіліся толькі на афіцыйна зацверджаных і добраўпарадкаваных зонах рэкрэацыі.

У асноўным парушэнні звязаны з несвоечасовым прыбіраннем пляжных тэрыторый, пакосам травы, вывазам смецця. Таксама па краіне былі адабраны 882 спробы вады, 50 з якіх не адпавядалі гігіенічным нарматывам. Частата забораў вады для лабараторнага аналізу складае раз на тыдзень.

Сёння па краіне абмежавана альбо прыпынена эксплуатацыя 21 пляжа. Забаронена выкарыстанне чатырох зон рэкрэацыі каля водных аб'ектаў у Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай абласцях. Прыпынена арганізацыя адпачынку на 10 пляжах па Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях. Акрамя таго, на сямі зонах адпачынку ў Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях уведзены абмежаванні на купанне дзяцей.

«Забарона выкарыстання вадаёмаў звязана з пагаршэннем мікрабіялагічных паказчыкаў вады, — патлумачыла Ірына Жаўняк. — А яны наўпрост залежаць ад умоў надвор'я. Чым раней прагравецца вада, тым лепшыя ўмовы складваюцца для развіцця мікраарганізмаў у ёй і тым большая верагоднасць узнікнення кішэчных расстройстваў у купальшчыкаў».

Інфармацыя аб фактах абмежавання, прыпынення ці забароны выкарыстання водных аб'ектаў абнаўляецца на сайце Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя кожную пятніцу.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■ Актуальна

БЯЗВІЗАВЫ РЭЖЫМ З ТУРЦЫЯЙ МОЖА БЫЦЬ УВЕДЗЕНЫ ДА КАНЦА ГЭТАГА ГОДА

Пра гэта паведаміў Віктар ГУМІНСКІ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, які ўзначальваў беларускую дэлегацыю падчас 22-й сесіі Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, што сёлета праходзіла ў Стамбуле з 29 чэрвеня па 3 ліпеня.

Віктар Гумінскі паведаміў, што падчас асамблеі яму давялося сустрэцца са спікерам турэцкага парламента Джамілем Чычэкам. На гэтай сустрэчы абмяркоўваўся шэраг пытанняў, якія існуюць у беларуска-турэцкіх адносінах. Адным з іх была ратыфікацыя дагавораў аб бязвізавым рэжыме паміж Беларуссю і Турцыяй. Пакуль вырашэнне гэтага пытання запавольвае праблема рэадмісіі (вяртання) турэцкіх грамадзян з Беларусі на тэрыторыю Турцыі.

Аднак Віктар Гумінскі выказаў думку, што бязвізавы рэжым з Турцыяй будзе ўведзены ўжо ў хуткім часе. «Нельга выключыць варыянт, пры якім беларускі і турэцкі парламенты ратыфікуюць гэтыя дагаворы яшчэ да заканчэння гэтага года», — паведаміў ён. Паўплываць на хуткасць ратыфікацыі дагавораў можа візіт міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея ў Турцыю, запланаваны на верасень. Акрамя гэтага, Гумінскі падкрэсліў, што ўжо трэці год запар падрыхтаваныя Беларуссю рэзалюцыі праходзяць працэдуру зацвярджэння ў ПА АБСЕ з максімальнай падтрымкай (сёлета беларуская рэзалюцыя пад назвай «Супрацоўніцтва ў мэтах пераходу да «зялёнай» эканомікі ў кантэксце ўстойлівага развіцця» была прынята адзінагалосна). Акрамя ўласна беларускай рэзалюцыі было прынята 18 паправак ад Беларусі да іншых рэзалюцый.

Дзейнасць беларускай дэлегацыі падчас 22-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ пазітыўна ацаніў амерыканскі кангрэсмэн Крыстафер Сміт, які падзякаваў айчынным парламентарыям за слушныя папраўкі.

Падчас сесіі разглядалася і рэзалюцыя ПА АБСЕ па Беларусі, якую кіраўнік нашай дэлегацыі назваў антыбеларускай. На выніковым галасаванні падчас прыняцця Стамбульскай дэкларацыі Беларусь падтрымалі прадстаўнікі 11 краін. Сярод іх былі і парламентарыі краін Еўрапейскага саюза: Грэцыі, Сербіі, Славакіі, Францыі, Чэхіі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

11 ЛІПЕНЯ 2013 г.
ЧАЦВЕР
№ 15 (15724)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Юлія КАДУШКЕВІЧ:

«Калі гэта патрэбна для ролі, я магу стаць невыносная»

У дзяцінстве яна марыла быць то пісьменніцай, то балерынай, то настаўніцай. Сёння яе пошукам ёсць тлумачэнне — прымярала на сябе розныя ролі, рыхтавалася да заваявання сцэнічнай прасторы. Зараз Юлія Кадушкевіч іграе ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Максіма Горкага, здымаецца ў кіно і вядзе на тэлебачанні праграму «Чакай мяне». Аднак актрыса і тэлевядучая не збіраецца спачываць на лаўрах і грэцца ў прамянях поспеху, а марыць вывучыць французскую мову, заняцца ігрой на фартэпіяна, праўда, пры ўмове, што гэта не будзе замінаць сцэнічным пераўтварэнням.

— У вас яркія ролі ў кіно і тэатры. Ці адчуваеце, што адбыліся ў прафесіі?

— Сказаць, што адбылася, не магу. Проста адчуваю па працы, што іду правільным курсам. І, хочацца спадзявацца, для майго існавання ў прафесіі ўсё жыццё яшчэ наперадзе.

— Як праяўляецца любоў гледача?

— Самае прыемнае, калі пазнаюць на вуліцы. Не так даўно сустрэў мяне мужчына і кажа: «Ой, наша вядучая! Добра выглядаеце! Вы малайчына!» У тэатры стаўленне гледача бачыш па апладысментах: калі ідзе спектакль, то заўсёды адчуваеш, ці любяць цябе як акцёра і персанажа. Тут прысутнічае такі нябачны кантакт, які дае цеплыню.

— Дыялог рэжысёра з акцёрам: якой пазіцыі на гэты конт прытрымліваецеся?

— Нас у Акадэміі вучылі, што рэжысёр заўсёды мае рацыю. Я іду за ім, імкнуся пачуць яго ідэю, рашэнне спектакля і майго вобразу. А потым стараюся сумясціць яго бачанне са сваім разуменнем ролі. Калі са свайго боку маю нейкія ідэі, то агучваю іх і абмяркоўваю. Магчыма, таму ў мяне і не здаралася гучных канфліктаў ні ў тэатры, ні ў кіно. Бываюць спрэчкі, але тут я за мяккую форму высвятлення пазіцый. Адстойваць нешта з крыкам — не мой падыход.

— У жыцці таксама канфліктаў пазбягаеце?

— Я іх не люблю. Зразумела, што яны здараюцца і на працы, і ў жыцці. Аднак стараюся любое пытанне вырашаць спакойна.

— Падрыхтоўка да ролі ўплывае на вашы паводзіны па-за сцэнай?

— Неяк мы працавалі над адным спектаклем, і вось тады дома я была проста невыносная. Як з роднымі, так і з сябрамі. А ўсё таму, што мая роля патрабавала канфліктнай сітуацыі. Таму, магу сказаць, што роля ўплывае на акцёра і па-за сцэнай, але не заўсёды заўважаеш змены і надаеш ім увагу. Бывае і так, што ў жыцці пачынаеш назіраць за сабой, запамінаць нейкія рэакцыі, каб выкарыстаць іх у будучай пастаноўцы. Увогуле, лічу, важна, каб акцёр назіраў за сабой і за іншымі, бо гэта дапамагае яму на сцэне.

— Якія адчуванні вам дорыць сцэна?

— Складана патлумачыць. Хвіліны да выхаду на сцэну напоўнены хваляваннем, і эмацыйны стан такі, нібы баішся і панікуеш. Аднак, як толькі аказваешся на сцэне, то поўнасцю паглыбляешся ў тыя задачы, якія выконваеш у спектаклі.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Самі пра сябе

ГАВОРАЦЬ І ПАКАЗВАЮЦЬ... СТУДЭНТЫ

Тэлебачанне — звыклы спосаб баўлення часу для большасці людзей. Даведацца пра апошнія навіны, паглядзець цікавую перадачу, ток-шоу або фільм — для многіх гэта лепшы спосаб адпачынку пасля працоўнага альбо вучэбнага дня. Але ў такім выпадку ТБ — не больш чым магчымасць расслабіцца. Нават самае цікавае пазней забываецца, адыходзіць на іншы план, калі ўключаеш тэлевізар «для фону». Але што вы скажаце, калі героі сюжэту — вы або вашы знаёмыя? Сапраўды, у такім выпадку размова будзе зусім іншай. Студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі маюць магчымасць працягнуць размову на гэтую тэму ўжо 12 гадоў — менавіта столькі існуе праект «СтудTV» — тэлебачанне для студэнтаў.

Першыя крокі

Калі ў 2001 годзе праект студэнцкага тэлебачання быў зацверджаны, перад аўтарамі ідэі паўстала задача навучыць студэнтаў, якія жадаюць стаць карэспандэнтамі і вядучымі, «азам» журналістыкі і рыхтаваць па магчымасці прафесіянальныя, а не аматарскія сюжэты.

«Спачатку даводзілася шукаць інфармацыю пра тое, як рабіць рэпартажы для тэлебачання», — успамінае заснавальнік і ідэйны кіраўнік «СтудTV» Максім Максак. БДУІР — яскравы прыклад найперш тэхнічнай навучальнай установы і, нягледзячы на тое, што сярод спецыяльнасцяў, па якіх рыхтуюць будучых спецыялістаў, ёсць і шчыльна звязаныя з тэлебачаннем (напрыклад, на факультэце тэлекамунікацый), з журналістыкай большасць студэнтаў на «вы» (за выключэннем, натуральна, супрацоўнікаў «СтудTV»). Бо ведаць пра спецыфіку тэлесігналу і рабіць сюжэт на ТБ — розныя рэчы. Тым не менш даўно ўжо стала аксіёмай: калі ты чагосьці сапраўды хочаш, то абавязкова даб'ешся. Таму, калі студэнт або студэнтка БДУІР мае жаданне займацца ў вольныя ад вучобы гадзіны падрыхтоўкай сюжэтаў або праграм для «СтудTV» — у яго (або яе) ёсць такая магчымасць.

У 2001 годзе Максім быў студэнтам трэцяга курса, але настолькі зжыўся з праектам, што і пасля заканчэння ўніверсітэта застаўся ў відэастудыі. За ўсе гады існавання «СтудTV» для яго было важна навучыць сваіх карэспандэнтаў быць падчас падрыхтоўкі сюжэта не студэнтамі, а менавіта журналістамі.

Былі праблемы з тэорыяй журналістыкі: што можа лічыцца навіной, чым адрозніваецца рэпартаж ад звычайнага сюжэта, як правільна задаваць пытанні... Гэтыя веды Максім і яго калегі атрымалі ў «школе» Інстытута журналістыкі БДУ. Ну, а за практыкай справа не стала. І хутка па якасці тэлепрадукту журналісты з тэхнічнай адукацыяй ужо не саступалі тым, хто вучыцца на тым жа журфаку. Так, у 2008 годзе на рэспубліканскім конкурсе праектаў моладзі «СтудTV» атрымала першае месца.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Важацкі хлеб

ПА ЗАКОНАХ ПЛЕМЕНІ

...паспрабавалі пажыць адзін дзень карэспандэнты «Чырвонкі». Для гэтага ім не спатрэбілася арганізоўваць складанае падарожжа куды-небудзь у джунглі ці на астравы, дастаткова было прыехаць на Мінскае мора ў дзіцячы аздараўленчы лагер «Спадарожнік» і пераквалiфікавацца ў важатых.

— Ну што? Гэта вы, значыць, сёння ў нас працуеце? — сустрэў нас старшы важаты Уладзімір Самуленкаў і хітра ўсміхнуўся.

Мы не ведалі, колькі і якіх дзяцей нам «выдадуць» праз хвіліну, а таму вельмі хваляваліся.

— Ведаеце, каб атрад увогуле не прыняў важатага, я такога не памятаю, — супакойваў Уладзімір. — На самы крайні выпадак у нас ёсць маленькая хітрасць, якая называецца «звальненне». Можна сказаць дзецям, што пакольку яны выхавальніка не слухаюцца, яго трэба адправіць дадому. На зборы такому даецца дзень, на працягу якога дзеці, як правіла, усімі сіламі намагаюцца за свайго важатага заступіцца.

Мы яшчэ пацікавіліся, з якога боку лепей «падступіцца» да нашых будучых выхаванцаў, а пасля Уладзімір урачыста аб'явіў:

— Пойдзеце ў першае племя!

У гэты момант міма прайшла дзяўчына з вялізнай гронкай бананаў, якую несла, абняўшы дзвюма рукамі. Што ж, племя дык племя...

...Бананы аказаліся другім сняданкам, а нашы дзеці — самымі старэйшымі ў лагеры. Пятнаццаці-сямнаццацігадовыя хлопцы і дзяўчаты адразу зацікавіліся, хто ж мы такія. Адной дзяўчынцы спадабаўся чахол на мабільным тэлефоне нашага фатографа Надзеі, размаляваны пад брытанскі сцяг. Але да знікнення паміж намі нейкага бар'еру было яшчэ далёка.

...Племя «Рапа-нуі» сабралася ў калідоры, каб абмеркаваць, што ж яны будуць рабіць у гэты дзень. Увогуле, называць атрады плямёнамі — гэта такая тэндэнцыя, якую падтрымлівае ўвесь лагер.

— Трэцяе племя, вы зусім страх страцілі! — нешта такое можна пачуць, калі прайсціся па калідорах корпуса.

Наша племя назвалася ў гонар сваіх «пабрацімаў» — абарыгенаў з вострава Пасхі. На сценах побач з «тэрыторыяй» беларускіх «Рапа-нуі» мы заўважылі расклееныя выявы каменных ідалаў з вышэйзгаданага вострава, якія называюцца мааі. А самы галоўны чалавек у атрадзе (прабачце, у племені), завецца сур'ёзна і грозна — эльгігантэ. «Рапа-нуі» са «Спадарожніка» аказаліся вынаходлівымі не толькі ў справе прыдумвання назваў, але і ў абсталяванні свайго жытла. Пакольку вулкана ў ваколіцах Мінскага мора не назіраецца, племя вырашыла змайстраваць яго сваімі рукамі.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

Фота Надзеі БУЖАН.

Гурткоў у летніку хапае. Адзін з іх — самая сапраўдная ёга.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
11 07 2013 г.

Ідэя фікс

МЫ ВЫБІРАЕМ... ЗА НАС ВЫБІРАЮЦЬ?

Адзін знаёмы індус, які навучаўся ў Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, распавёў мне, якім чынам ён апынуўся ў Беларусі. Аднойчы бацькі паставілі перад ім пытанне рубам: куды збіраешся паступаць? Самрат (так завуць майго знаёмага) задумаўся. «Хочаш у Беларусь?» — «А як я туды буду дабірацца?» — «На самалёце». На самалёце Самрат ніколі не лятаў, а паспрабаваць вельмі хацелася. Адным словам, выбар быў зроблены на карысць далёкай краіны. А па якіх крытэрыях выбірае і прафесію, і навучальную ўстанову беларуская моладзь?

Як вынікае з аповедаў абітурыентаў гэтага і папярэдніх гадоў, свядомы выбар — лёс нямногіх. Даволі часта выбар ВНУ выпускнікі робяць пад уплывам бацькоў. **Алеся Астраўцова, сёлетняя абітурыентка,** удзельнічае ва ўступнай кампаніі ўжо другі год запар, бо яе бацька, працуючы на радыё, вельмі хацеў, каб дачка пайшла па той жа сцежцы. Заплаціўшы за першы семестр навучання на журфаку, Алеся... забрала дакументы. А за астатнія паўгода асіліла з рэпетытарам біялогію і ажыццяўляе зараз сваю даўнюю мару — паступае вучыцца на псіхолага.

І такія сітуацыі, на жаль, не рэдкасць. Добра яшчэ, калі зробленую памылку маладыя людзі зразумеюць яшчэ на першых курсах, а не ўладкаваўшыся на працу пасля атрымання дыплома.

Павел Аксіновіч, выпускнік ліцэя №1 г. Мінска, марыў паступіць на журфак яшчэ з 9 класа. Але на гадавых курсах пры ўніверсітэце зразумеў, што не адолее творчых іспытаў, а, значыць, не трапіць на бюджэт. Тады хлопец стаў рыхтавацца на гістфак. На пытанне «А як жа журфак?», Паша адказаў: «Не ў гэтым годзе». І ён не ўтойвае, што на гістфак ідзе, толькі каб атрымаць дыплом.

Але, вядома, вялікі працэнт і тых, хто свядома паступае на тую ці іншую спецыяльнасць, тых, хто патраціў гады падрыхтоўкі, каб добра здаць тэсты. **Выпускніца гімназіі г. Беразіно Юлія Вярбіцкая** марыла стаць перакладчыцай яшчэ з 8-га класа. Спачатку разлічвала на Белдзяржуніверсітэт, бо там ніжэйшы прахадны бал. Але потым усё ж такі вырашыла спрабаваць паступаць у лінгвістычны ўніверсітэт. Увесь 11-ты клас упарта працавала з настаўнікамі і рэпетытарамі. І, дарэчы, здала рускую мову на 97 балаў. Калі выбар прафесіі свядомы, асэнсаваны, то з'яўляецца і матывацыя. Калі ёсць мэта, то і вынік не прымусіць сабе чакаць.

На жаль, вышэйшая адукацыя — гэта своеасаблівая ідэя фікс для сучаснай моладзі: яна патрэбна ўсім (прынамсі, так усе думаюць). І вялікая колькасць абітурыентаў, якія не набралі сёлета на ЦТ мінімальныя балы, — красамоўны доказ таго, наколькі «свядома» яны рыхтаваліся да ўступнай кампаніі.

Затое, можа, цяпер гора-абітурыенты будуць глядзець на жыццё больш рэальна і выбіраць прафесію ў адпаведнасці са сваімі схільнасцямі і здольнасцямі? Праўда, намаганняў для дасягнення мэты давядзецца прыкладаць нашмат больш...

Вікторыя ЧАПЛЕВА.

Будзь у курсе

«МАДЭРНІЗАЦЫЯ» ПЕДАГАГІЧНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯЎ

З 2013 года Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт цалкам пераходзіць на чатырохгадовы тэрмін навучання. Змены закранулі 10 з 12 факультэтаў. Два факультэты — фізічнага выхавання і псіхалогіі — падрыхтаваліся да пераходу на чатырохгадовы тэрмін навучання яшчэ раней.

У сувязі з гэтым шмат спецыяльнасцяў змянілі свае назвы. Напрыклад, спецыяльнасць «Матэматыка. Інфарматыка» стала называцца «Матэматыка і інфарматыка», «Фізіка. Інфарматыка» — «Фізіка і інфарматыка», «Біялогія. Хімія» — «Біялогія і хімія» і г.д. Ва ўніверсітэце запэўніваюць, што для будучых выпускнікоў нічога прынцыпова не зменіцца — яны змогуць выкладаць першы і другі прадмет. Некаторыя трансфармацыі адбыліся ў змесце адукацыйных праграм: так, было выключана дубліраванне некаторых тэм, давялося «ахвяраваць» і некаторымі неактуальнымі, другарадным тэмамі...

Але некаторыя «падвоеныя» спецыяльнасці ўсё ж страцілі другую, дадатковую спецыяльнасць. Так, факультэт спецыяльнай адукацыі цяпер прапануе спецыяльнасць «Лагапедыя» замест «Лагапедыя. Спецыяльная псіхалогія», «Алігафрэнапедагогіка» замест «Алігафрэнапедагогіка. Дашкольная адукацыя». Без «дадаткаў» засталіся «Сурдапедагогіка» і «Тыфлапедагогіка».

Зніклі дадатковыя спецыяльнасці і на факультэце сацыяльна-педагагічных тэхналогій. Замест «Сацыяльнай педагогікі. Практычнай псіхалогіі», «Сацыяльнай педагогікі. Выхаваўчай работы ў адукацыйных установах» будзе ажыццяўляцца набор проста на «Сацыяльную педагогіку». Ёсць таксама спецыяльнасці, на якія ўніверсітэт увогуле не будзе прымаць абітурыентаў сёлета. Напрыклад, на спецыяльнасць «Біялогія. Фітадызайн ландшафту і інтэр'ера», «Геаграфія. Экскурсійна-краязнаўчая работа». Таксама не будзе набору на спецыяльнасць «Фізіка. Матэматыка». Але з'явіліся такія спецыяльнасці, як «Фізіка і інфарматыка» і «Фізіка і тэхнічная творчасць». Таксама не будзе ажыццяўляцца набор на спецыяльнасць «Пачатковая адукацыя. Беларуская мова і літаратура». Але ва ўніверсітэце застаюцца спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура» на факультэце беларускай і рускай філалогіі і «Пачатковая адукацыя» — на факультэце пачатковай адукацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ГАВОРАЦЬ І ПАКАЗВАЮЦЬ... СТУДЭНТЫ

Праз церні — да «зорак»

Ганна Берасцень прыйшла працаваць у БДУІР дзесьці год таму, адразу пасля заканчэння навучання па спецыяльнасці «Аўдыявізуальныя СМІ» на факультэце журналістыкі БДУ. Цяпер яна — рэдактар відэастудыі, карэспандэнт прэс-службы, журналіст. Так атрымалася, што менавіта год таму скончылі БДУІР самыя прафесіянальныя карэспандэнты, і на іх месца прыйшлі новыя, зусім яшчэ нявопытныя. Зразумела, рабіць тэлесюжэты, манціраваць відэа нельга навучыцца за некалькі гадзін. А самастойна — яшчэ складаней. Таму дзяўчына ўзялася сур'ёзна за падрыхтоўку новага пакалення журналістаў. «Я чытала сапраўдныя лекцыі, расказвала асноўнае з тэорыі, неабходнай для падрыхтоўкі сюжэтаў», — успамінае Ганна. Рэгулярна былі заняткі па тэхніцы маўлення, ды і зараз у кабінеце, дзе знаходзіцца «штаб-кватэра» студэнцкага тэлебачання, над сталом Ганны вісяць скорагаворкі — каб было чым заняцца ў вольную хвіліну.

За практыкай справа не стала. І хутка па якасці тэлепрадукту журналісты з тэхнічнай адукацыяй ужо не саступалі тым, хто вучыцца на тым жа журфаку.

Для карэспандэнта, безумоўна, важна гаварыць чыста і правільна, але яшчэ больш важны змест, тое, пра што і якімі словамі расказваецца. Студэнтам тэхнічнай навучальнай установы можна нешта дараваць, але журналістам — наўрад ці. Каму цікава глядзець тэлесюжэт, напоўнены заштампаванымі выразамі і паўторамі? Таму і над гэтым давялося папрацаваць. «Затое ўжо пасля 4-5-га сюжэтаў мне амаль не было да чаго прычапіцца», — адзначае Ганна. Відаць, што заняткі не прайшлі дарэмна. Вось і атрымалася, што пасля першых, магчыма, непрафесіянальных, часам няўдалых сюжэтаў, маладыя карэспандэнты «СтудTV» упэўнена сталі на шлях, які, не выключана, зробіць іх сапраўднымі зоркамі, няхай і ў маштабе alma mater.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Падпрацоўка або прафесія?

Ала Баярка, кіраўнік прэс-службы БДУІР, на маё пытанне, ці з'яўляецца «СтудТБ» месцам практыкі для тых студэнтаў, якія атрымліваюць спецыяльнасць, звязаную з тэлебачаннем, адразу ж адказала адмоўна. Гэта зусім розныя віды дзейнасці. Тым не менш некаторыя студэнты, якія падчас сваёй вучобы шмат часу аддавалі студэнцкаму тэлебачанню, цяпер працуюць на TV або атрымліваюць другую адукацыю на факультэце павышэння і перападрыхтоўкі кадраў Інстытута журналістыкі БДУ. Для большасці аўтараў сюжэтаў для студэнцкага тэлебачання гэта, хутчэй, цікавая магчымасць праявіць сябе ў новай ролі.

Тыя, чые сюжэты былі ўключаны ў выніковы выпуск навін (звычайна ён выходзіць адзін раз на месяц, але трансляцыя яго паўтараецца на экранах у розных карпусах шмат разоў), пазней атрымліваюць невялікія грашовыя прэміі. Такім чынам, «СтудTV» можна назваць захапленнем, якое прыносіць прыбытак.

Дастукаліся!

Ёсць шмат канцэпцый таго, якой павінна быць журналістыка. Сярод іх значнае месца па-ранейшаму займае канцэпцыя «чацвёртай галіны ўлады». Гэта значыць, што праблема, закранутая ў сродках масавай інфармацыі, можа быць паспяхова вырашана — так, як гэта было б, калі б чалавек звярнуўся да прадстаўнікоў улады. Мне стала цікава, а ці можа рэпартаж «СтудTV» вырашыць праблему, якая чымсьці перашкаджае студэнтам БДУІР?

Высветлілася,што ёсць спецыяльная праграма — «Дастукацца». Яна праблемнага характару. Так, у адным з карпусоў зімой увесь час узнікала праблема «заторaў». Студэнтаў шмат, а дзверы — толькі адны. Адным трэба выйсці, другім — зайсці. Побач — яшчэ двое дзвярэй, але яны чамусьці заўсёды былі замкнёныя. Дана Кавалёва, вядучая праграмы, зрабіла сюжэт на гэтую тэму, і неўзабаве праблема вырашылася. Відаць, увесь гэты час ключы былі згублены, а пасля тэлесюжэта раптам знайшліся.

Другая праблема — харчаванне студэнтаў. Анекдоты пра галодных студэнтаў ужо адрошчваюць «бароды». Але ў сталовых розных факультэтаў БДУІР цэны раптам сталі адрозніваца. Зразумела, што студэнты тых будынкаў, дзе «перакусіць» каштуе танней, шум не паднімалі, а вось тыя, што пераплачвалі, пачалі злавацца і наракаць. Рэпартаж пра сталовыя вырашыў пытанне: цэны сталі аднолькавымі ва ўсіх карпусах.

Чаму трус не гуляе ў хакей

Як падзялілася са мной Ганна Берасцень, сюжэты бываюць як беларускамоўныя, так і рускамоўныя. Адзін з беларускамоўных мы з ёю і паглядзелі. Называўся ён: «Чаму **трус** не гуляе ў хакей?». Спадзяюся, чытачы заўважылі памылку ў перакладзе, чаго не скажаш пра студэнтаў БДУІР. Ну дзе вы бачылі... труса, які гуляе ў хакей або хоць у валейбол? У чалавечыя гульні гуляюць, хутчэй за ўсё, толькі дрэсіраваныя жывёлы.

Пасля першых, магчыма, непрафесіянальных, часам няўдалых сюжэтаў, маладыя карэспандэнты «СтудTV» упэўнена сталі на шлях, які, не выключана, зробіць іх сапраўднымі зоркамі, няхай і ў маштабе alma mater.

❑❑❑

Пакуль некаторыя асабліва прынцыповыя выкладчыкі наракаюць на спазненні студэнтаў з-за таго, што тыя падчас перапынку не паспелі паглядзець да канца перадачу пра «сябе любімых», аўтары праекта думаюць, як зрабіць «СтудTV» яшчэ больш цікавым. Карпаратыўны характар праекта — «усе ведаюць адзін аднаго» — пакуль задавальняе, таму задача трансфармаваць «СтудTV» у агульнарэспубліканскі канал не стаіць. З другога боку, студэнцкае тэлебачанне не мае сеткі вяшчання — праграмы выходзяць тады, калі іх падрыхтуюць, і транслююцца на экранах у розных карпусах. Калі ж з'явіцца, нарэшце, расклад — што і праз які прамежак часу павінна выходзіць — «СтудTV» можна будзе назваць паўнацэнным карпаратыўным тэлеканалам.

Зноў жа, ужо зараз праект цікавы перадачамі пра жыццё моладзі, якіх так не хапае на цэнтральных каналах беларускага тэлебачання. Магчыма, нейкія сюжэты неўзабаве пачнуць выходзіць на «Беларусь-1» або АНТ? Думаю, гэта будзе добрая ідэя.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

Праверка на дарослась

Фота Надзеі БУЖАН.

ХТО КУДЫ, А Я — НА ПРАЦУ!

Лета — яно такое доўгачаканае і шматабяцальнае... Вольны час, без хатніх заданняў і настаўнікаў... Пляжы, паркі, дача, мора... Але гэта не толькі чароўная пара, якая абяцае загар і забавы. У летнія месяцы маладыя людзі могуць, нарэшце, пайсці папрацаваць. Што іх падштурхоўвае да гэтага кроку?

Настасся БАРОДАЎКА, 17 гадоў:

— У мяне зараз шмат вольнага часу, больш, чым трэба проста на адпачынак, і марнаваць яго, седзячы за камп'ютарам, шкада. Таму я іду працаваць, каб самой зарабіць грошы, як той казаў, праверыць сябе на «трываласць». Патрачу заробак на падарожжа па Беларусі. Ёсць шмат месцаў, куды хачу з'ездзіць, пабачыць нешта на свае вочы.

Ілона КРЫВАЛЬ, 17 гадоў:

— Іду працаваць таму, што патрэбны грошы. Лішнімі яны ніколі не бываюць, асабліва ў вялікай сям'і. На што пойдзе зароблена сума? Можа, на мора паеду. А ўвогуле, грошы заўсёды ёсць на што патраціць!

Максім ЯСІНСКІ, 17 гадоў:

— Што мяне падштурхнула пайсці працаваць? Хацелася мець уласныя грошы. Я лічу, што ў Мінску ёсць усе ўмовы для працаўладкавання школьнікаў. Проста тыя, хто не хоча працаваць, кажуць, што «нельга», «непаўналетніх не бяруць», «мала плацяць» і таму падобнае. Але калі сапраўды захочаш знайсці вакансію — знойдзеш. Напрыклад, можна звярнуцца ў БРСМ. Варта толькі зайсці на сайт, паглядзець, разабрацца, патэлефанаваць і дамовіцца. Ці схадзіць у цэнтр занятасці свайго раёна, як зрабіў я. Там прапануюць некаторыя варыянты. Скажам, я працаваў у арганізацыі інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны Першамайскага раёна: кожны дзень друкаваў дакументы.

Я правяла ўласнае невялікае «расследаванне»: куды лепш звярнуцца ў пошуках вакансій?

Самы лёгкі варыянт — падысці ў сваю школу і пацікавіцца, якую працу там могуць прапанаваць. Але ж трэба памятаць, што працоўны дзень школьніка 14-16 гадоў можа доўжыцца не больш за 4,5 гадзіны. Аб'ём працы і яе аплата, роўная 5 930 рублёў за гадзіну, для ўсіх аднолькавыя. Атрымліваецца, што ў месяц заробак такога школьніка можа скласці амаль 500 тысяч рублёў. А моладзь ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў можа працаваць у дзень не больш за сем гадзін.

Асноўныя віды працы, якія мне прапанавалі ў школе: прыборка, азеляненне газонаў, друкаванне дакументаў. Таксама на базе школы арганізаваны лагер працы і адпачынку (УП «Зелянбуд»). Зрэшты, гэта далёка не адзіны варыянт працаўладкавання для школьнікаў. Калі ўмовы, прапанаваныя школай, не спадабаліся, можна, як ужо гаварылася вышэй, смела звяртацца ў цэнтр занятасці свайго раёна.

Наступны варыянт — пошук вакансій у інтэрнэце. Аднак тут могуць быць і свае мінусы. Па-першае, магчымая недакладная інфармацыя. Па-другое, каб не атрымалася так, што вы папрацавалі, а вам не заплацілі. Патрабуйце завяраць усё афіцыйна. На сайтах прапануюць паспрабаваць сябе ў ролі кур'ера, афіцыянта, расклейшчыка аб'яў, тэлефоннага аператара ў выдавецтве... Літаральна вочы разбягаюцца ад такой колькасці вакантных месцаў! Як не памыліцца ў выбары свайго часовага працоўнага месца? Тэлефануйце усім працадаўцам, удакладняйце, параўноўвайце і не забывайце раіцца з дарослымі!

У любым выпадку, не варта выбіраць працу, якая зусім не падабаецца або можа выклікаць пэўныя нязручнасці.

Сонца, спёка... Лета. А я іду на працу! На тую працу, якая будзе мне па душы.

Настасся РАГАЧОВА.

ПА ЗАКОНАХ ПЛЕМЕНІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Вулкан «плюецца» лавай, якая складаецца з соды, воцату і аранжавай гуашы. А побач яшчэ і вадаспад «булькоча».

Я нясмела заходжу ў пакой да хлопчыкаў, адчыняю адну з шуфляд. Там розныя шакаладныя батончыкі, печыва. Нічога забароненага! І пяску не знайшлося. Дзявяткі заслугоўваюць!

Я з цікавасцю разглядала ўсе гэтыя штукі, а тым часам на нарадзе племені агучвалі планы на дзень: спачатку — прыборка пакояў і праверка іх санітарнага стану. Пасля — гульні на вуліцы, вакальны гурток для тых, хто пажадае, абед, ціхая гадзіна, а пасля яе — падрыхтоўка да «Хвіліны славы», што мае адбыцца а восьмай гадзіне вечара. Падрыхтоўка, дарэчы, без дапамогі важатых. Да гэтага моманту чытачы маглі падумаць, што нас адправілі да «племені» без усялякай дапамогі прафесіяналаў. На самой справе гэта не так. Па-першае, мы трапілі ў «Спадарожнік» у дзень самакіравання, а гэта значыць, што некаторыя хлопцы і дзяўчаты са старэйшых плямёнаў узялі на сябе пэўныя абавязкі важатых, а па-другое, «дарослыя» важатыя Маргарыта Шавела і Ірына Старавойтава таксама ўвесь дзень былі з намі, дакладней — мы з імі. Дзяўчаты — удзельніцы студэнцкага педагагічнага атрада «Ветразь», які не першы год працуе ў «Спадарожніку», амаль што нашы равесніцы, адной дзевятнаццаць гадоў, а другая скончыла летась універсітэт, але яны звяртаюцца адна да адной па бацьку, каб і дзеці сур'ёзна іх успрымалі. Ірына і Маргарыта завяршылі планёрку, пасля чаго нас чакала першае заданне ў якасці выхавацеляў — разам з Маргарытай праверыць чысціню пакояў і выставіць адзнакі.

— Мы шукаем пясок у ложку, а таксама «забароненую ежу» — чыпсы, сухарыкі, макарону хуткага прыгатавання, фарбаваныя газіраваныя напоі, карацей — усё шкоднае. Знаходзім — канфіскуем, — інструктуе Маргарыта.

Я нясмела заходжу ў пакой да хлопчыкаў, адчыняю адну з шуфляд. Там розныя шакаладныя батончыкі, печыва. Нічога забароненага! І пяску не знайшлося. Дзявяткі заслугоўваюць!

У пакоі дзяўчынак адразу чую водар парфумы, крэмаў і, здаецца, лаку для валасоў. Тут таксама ніякіх чыпсаў у шафе. Маргарыта, у адрозненне ад мяне, адразу адчыняе менавіта тыя скрынкі, у якіх дзеці хаваюць прадукты. Але і яна нічога не знаходзіць. Мне падумалася, што з самымі старэйшымі ўвогуле такіх праблем быць не можа: няўжо дарослыя, у прынцыпе, людзі не разумеюць, што нязручна спаць у пяску, а прывезеныя «кантрабандай» шкодныя ласункі ўсё роўна знойдуць. І ўвогуле, старэйшых не трэба вадзіць за руку ў сталовую, яны не плачуць «Хачу да мамы». Мабыць, важатаму з такімі нашмат прасцей, чым з малечай.

Па расповедах маіх новых «калег», кожны ўзрост складаны па-свойму. Каб арганізаваць малых, трэба прыдумаць цікавую гульню, казку, яны яе паслухаюць, паверацъ, і гэтага будзе дастаткова, а вось перад старэйшымі выхавацелю важней за ўсё паказаць свой аўтарытэт, зрабіць так, каб племя адчула камандны дух, аб'яднаць усіх вакол сябе...

...Мы з Маргарытай накіроўваемся праводзіць вакальны гурток, па дарозе сустракаем суседняе племя.

— Добрай раніцы! — вітаецца з важатай малы хлапчук.

— Прывітанне, Данечка! А хто ж табе кожную раніцу робіць такія іракезы? У цябе ёсць гель для валасоў? — цікавіцца важатая.

— Не-е. Гэта я проста так бяру і раблю, — Данік вырашае зрабіць са сваёй прычоскі таямніцу, а ў самога па скроні бяжыць кропелька вады.

Маргарыта расказвае, што калі многія падлеткі з задавальненнем пражываюць у лагеры ўсё лета (пасля ў размовах з дзецьмі мы высветлілі, што некаторыя ў «Спадарожніку» правялі дваццаць змен і больш), то такая вось малеча часта просіцца дадому і плача. На мінулай змене ў самым малодшым племені былі шасцігадовыя дзеткі, дык выхавацелям даводзілася некаторых з іх цэлымі днямі трымаць на руках...

...На вакальны гурток прыйшло чалавек сем дзяўчат рознага ўзросту і два хлапчукі з ужо знаёмага нам племені. Маргарыта просіць кожнага праспяваць што-небудзь. Старэйшыя дзяўчаты выходзяць першымі, не саромеюцца, маленькія ідуць па двое і спяваюць куплет пра «розы тёмно-алые». Мужчынская палова гуртка, «галантна» прапусціўшы дзяўчат, да апошняга не адважваецца заспяваць.

— Скорагаворку ці верш! — просіць Маргарыта.

Фота Надзеі БУЖАН.

Гульня на давер насамрэч дапамагае разняволіцца.

— Ішла Саша па шашы і смактала сушку! — нарэшце выдае хлопец па імені Уладзіслаў.

— А дзе эмоцыі? — не міргнуўшы вокам «падтрымлівае» гульню Маргарыта.

Улад яшчэ колькі разоў паўтараў словы пра Сашу, пакуль не «разлавaўся» на яе і не праспяваў з усеагульнай падтрымкай «В траве сидел кузнечик».

Сышліся на тым, што хлопцы выдатна прачытаюць рэп на канцэрце напрыканцы змены. А пасля ўсе разам адправіліся на вуліцу, дзе ўжо чакала Ірына з «нашым» племенем. Надышоў час гульняў на свежым паветры! Мы з фатографам шчыра спадзяваліся паназіраць за гэтым, так бы мовіць, з бяспечнай адлегласці, але дзе тут! Гуляюць усе!

Першая гульня — стаць у кола і ўзяцца за рукі. Нехта адзін бегае вакол і ўсімі сіламі спрабуе прарвацца ў яго. Задача астатніх — спачатку ні за што яго не пускаць, толькі пасля ў якасці жэсту «добрай волі» нехта можа расчапіць рукі. Пакуль бегаюць іншыя, мне цікава, азартна і весела. Але тут Ірына просіць мяне стаць па-за кругам. Я бягу, бягу, бягу, намагаюся прыдумваць розныя хітрыкі, каб усё ж у кола патрапіць. Праўда, у мяне гэтага не атрымліваецца, але калі далі каманду, што рукі можна расчапіць, усе згадзіліся пусціць мяне туды.

Далей — гульня на давер. Вядомая многім: трэба ўпасці з заплюшчанымі вачыма на рукі чалавека, да якога стаіш спінай. І яшчэ адна гульня — «Вантуз», калі ты стаіш у цэнтры кола, заплюшчыўшы вочы, і моцна ўпіраешся нагамі ў зямлю, а тыя, хто стаіць навокал, круцяць цябе ва ўсе бакі. Расплюшчваць вочы забаронена! Адчуванні — як на каруселі!

Але і гэта было яшчэ не ўсё. Далей Ірына прапанавала ўсім стаць у дзве шарэнгі тварам адзін да аднаго, а мяне папрасіла прайсціся паміж імі, заплюшчыўшы вочы. Я пайшла і зусім не чакала, што на вуха кожны з дзяцей павінен быў сказаць мне які-небудзь камплімент. Нават не думала, што ад такога «вадаспаду слоў» можна атрымаць столькі пазітыву. Прайсціся пад «вадаспадам» мусіў кожны.

Мяне зацікавіла, што ж адчуваеш, калі спрабуеш трымаць увагу такой колькасці падлеткаў? Я прапанавала племені пагуляць у «рэдакцыю»: падзяліла іх на дзве каманды і кожнай дала заданні як мага хутчэй даведацца тую ці іншую інфармацыю. Напрыклад, колькі пялёсткаў вунь на той жоўтай кветцы, як завуць аднаго з дзяцей, што гуляюць ля арэляў. Сапраўды, зрабіць так, каб усе як адзін слухалі тое, што ты гаворыш і цікавіліся гэтым, вельмі цяжка. Хвалюешся, ці спадабаецца гульня, як зрабіць так, каб падлеткі ёй захапіліся. Зразумела, у спрактыкаванай Ірыны захапіць увагу племені атрымлівалася нашмат лепш, чым у мяне. Але менавіта пасля таго, як разам з племенем я пагуляла ва ўсё вышэйзгаданае, мой унутраны бар'ер і страх перад роляй важатага пачалі знікаць.

Пасля ўсе яшчэ крыху пагулялі ў мафію і пайшлі на стадыён з валейбольным мячом. Паколькі я была не ў спартыўным абутку, давялося далучыцца да балельшчыкаў, а нястомная Ірына разам з хлопцамі і дзяўчатамі адбівала мяч. Калі не ведаеш, дзе выхавальнік, а дзе дзяўчаты з атрада, не адразу здагадаешся, хто ёсць хто. Валейбол працягваўся нядоўга, бо настаў час карміць наша племя...

...Усталовай давалі малочны суп альбо суп са свежай капусты, катлету, рыс, кавалачкі памідора і кісель. Мы з Маргарытай, надзеўшы фартушкі і касынкі, пайшлі дзяжурыць. На сталах ужо стаялі каструлькі з супам і кубкі кісялю, нам засталося толькі паставіць талеркі з другой стравай. Але ж гэта не на адно наша племя! І тут пачалося: хапаем талеркі, ставім, бяжым назад. Работніцы сталовай, накладваючы ежу, упраўляюцца шпарчэй за нас, таму даводзіцца хуткасць павялічваць. Нарэшце ўсё зроблена і мы сядаем за стол. Пасля гульняў на свежым паветры есці хочацца жудасна. Далей нас чакае «ціхі час»...

Надышоў час гульняў на свежым паветры! Мы з фатографам шчыра спадзяваліся паназіраць за гэтым, так бы мовіць, з бяспечнай адлегласці, але дзе тут! Гуляюць усе!

...Прымусіць спаць удзень пятнацацігадовых падлеткаў...Што можа гучаць больш камічна. Але правілы ёсць правілы, таму ў «ціхі час» калі не спіш, то проста ціхенька сядзіш на ложку ў сваім пакоі, на калідор — ні нагой. Адказную місію падтрымання парадку на працягу дзвюх з паловай гадзін даверылі нам і дзецям-важатым, якія ўдзельнічалі ў дні самакіравання. Прайшло паўгадзіны... Здаецца, усе сцішыліся. Мы з фатографам выраšаем прайсціся па калідоры. Дзверы ва ўсе пакоі павінны быць адчынены. У адным з пакояў хлапчук з малодшага племені паказвае, як умее стаяць на галаве. Убачыўшы нас, міла ўсміхаецца і без размоў кладзецца ў ложак. Нехта ж сапраўды ўжо спіць. Пасля гульняў, шпацыру па калідоры і абеду я прысела на мяккае крэсла і сама ледзь не задрамала. Як гэтыя важатыя вытрымліваюць цэлы дзень на нагах, не разумею...

...Так склалася, што мы не змаглі пажыць «па законах племені» да адбою, хоць нас вельмі прасілі застацца. Колькі ўсяго яшчэ магло чакаць нас на дыскатэцы, на «Хвіліне славы»!.. Але ж і за той час, які мы правялі з важатымі ў «Спадарожніку», можна было адчуць, колькі сіл патрабуе гэтая праца. Наша племя аказалася дарослым, досыць самастойным і выхаваным, а не шкодным і непаседлівым, чаго я вельмі баялася, але стома ўсё роўна была адчувальнай нават пасля няпоўнага выканання абавязкаў важатага. Бо ён для сваіх выхаванцаў — і сябар, і мама-тата, і спявак, і рэжысёр, і дэкаратар, і мастак, і псіхолаг, і трэнер... Відавочна, так можа не кожны.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

Мінск — Мінскі раён — Мінск.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
11 07 2013 г.

Не быць «Базару» без мантажнікаў!

***Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж мантажных і пад'ёмна-транспартных работ** прапануе навучанне па васьмі рабочых, вельмі запатрабаваных на сучасным рынку працы спецыяльнасцях. Навучанне ў каледжы — гэта не толькі якасная тэарэтычная і практычная падрыхтоўка, але і магчымасць правесці гады вучобы з максімальным камфортам. Дастаткова назваць такія жыццёва важныя моманты, як бясплатнае харчаванне ў сталовай, якая нагадвае лепшыя кавярні горада, і магчымасць займацца самымі рознымі відамі спорту ў выдатных трэнераў. У хуткім жа часе для іншагародніх гэта будзе яшчэ і пражыванне ў адрамантаваным інтэрнаце. Па заканчэнні каледжа неабходна на працягу аднаго года адпрацаваць на адным з мінскіх прадпрыемстваў. Надалей нішто не перашкаджае працягнуць вучобу і ў ВНУ.*

РАБОЧАЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ — СІНІЦА Ў РУКАХ

Сёння, дарэчы, многія выпускнікі школ адразу нацэльваюцца на атрыманне вышэйшай адукацыі. Прычым без уліку ўласных здольнасцяў, а проста, як той казаў, «дзеля корачкі». Аднак рабочая спецыяльнасць — гэта заўсёды магчымасць рэальнага падзаробку, «сініца ў руках». Да таго ж стаць навучэнцам прэстыжнай прафесійна-тэхнічнай установы стала не так складана — з-за той дэмаграфічнай сітуацыі, якая склалася. Самі прафесійныя тэхнічна-навучальныя ўстановы ўсяляк імкнуцца заахвочваць моладзь на вучобу ў сваіх сценах, паколькі важнасць, неабходнасць рабочых спецыяльнасцяў у нашым паўсядзённым жыцці ніхто не адмяняў.

Дырэктар Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа мантажных і пад'ёмна-транспартных работ Таццяна ЯСТРАБ.

— Наш каледж — адзіная навучальная ўстанова ў краіне, якая рыхтуе такіх спецыялістаў, як машыніст вежавага крана і мантажнік вонкавых трубаправодаў, — расказвае **дырэктар Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа мантажных і пад'ёмна-транспартных работ Таццяна ЯСТРАБ.** — Другі год запар адзіныя ў горадзе мы рыхтавалі вадзіцеля грузавога аўтамабіля міжнароднай перавозкі — для арганізацый, якія займаюцца міжнароднымі транспартнымі перавозкамі. Спецыяльнасці ў нас такія, што прымаем на навучанне толькі юнакоў. Хіба на спецыяльнасць «Машыніст маставога крана» могуць прымацца дзяўчаты.

Асноўныя «спажыўцы» нашых кадраў — нашы даўнія сябры, з якімі заключаны адпаведныя дамоўленасці. Гэта ААТ «Белэлектрамантаж», «Прамтэхмантаж», «Управленне механізацыі № 79», «Трэст-15 «Спецбуд», ЗАТ «Электрасэрвісбуд», а нядаўна да гэтага спіса далучылася і Беларуская асацыяцыя міжнародных аўтаперавозчыкаў. Мы маем права рыхтаваць кадры для прадпрыемстваў і арганізацый рознай формы ўласнасці. Штогадовыя заяўкі дасылаюць самыя розныя арганізацыі, аднак перавагу мы аддаём, вядома, дзяржаўным і тым, з кім супрацоўнічаем даўно. Вядома, заявак паступае заўсёды больш, чым мы можам прапанаваць. А калі так, то наш выпускнік мае гарантаванае працоўнае месца. Узяць на падрыхтоўку больш навучэнцаў пакуль не дазваляюць магчымасці. Гэта пацягне за сабой павелічэнне педагагічнага складу. А сёння з гэтым не проста. Да таго ж выкладчык для падрыхтоўкі спецыялістаў вежавага крана — наогул дэфіцыт. Іх не рыхтуюць, а таму мы запрашаем некага з ліку практыкаў, хто непасрэдна працуе на такой тэхніцы.

Мы рыхтуем па спецыяльнасцях, запатрабаваных на прадпрыемствах горада. На некаторыя ідуць толькі іншагароднія. Гэта нармальна. Не ўсе жадаюць застацца на прапанаваным месцы пасля абавязковай адпрацоўкі. Многія хочуць усяго і адразу, неадэкватна расцэньваюць свае здольнасці і магчымасці. І маладым людзям, і іх бацькам мы спрабуем тлумачыць: аўтаслесар — гэта не той, хто проста так атрымлівае вялікі заробак. А той, хто валодае тэхнічным мысленнем, ведае асновы фізікі і механікі і г.д.

Толькі так можна разлічваць на паступовае павышэнне аплаты сваёй працы. Ёсць прафесіі, як, скажам, мантажнік вонкавых трубаправодаў, дзе трэба круглы год працаваць пад адкрытым небам. Непрывабная праца, хоць і добра аплачваецца. Наша задача як адукацыйнай установы — расказаць пра значнасць гэтай прафесіі, падкрэсліць яе важнасць. Ці ўзяць мантажніка металаканструкцый — без такога спецыяліста не адбудзецца ніводнае канцэртнае шоу пад адкрытым небам, у тым ліку такое значнае мерапрыемства, як «Славянскі базар у Віцебску»...

Нашаму будынку 59 гадоў, і тут ніколі не было капітальнага рамонту. Аднак за апошнія пяць гадоў многае ўдалося змяніць, адрамантаваць і аднавіць фактычна ўсё, заканчваючы гаспадарчымі памяшканнямі. Можна сказаць, удасканалілі матэрыяльную базу на 90 працэнтаў. Цяпер у парадку і кабінеты, і калідоры. Пры гэтым мы не ўзялі з бюджэту ні капейкі. Усё зроблена, што называецца, уласнымі рукамі, за ўласныя сродкі і сродкі нашых базавых прадпрыемстваў і арганізацый, з якімі мы цесна супрацоўнічаем.

Прыгожую агароджу на тэрыторыі каледжа зрабілі зваршчыкі першага курса. Работы, звязаныя з металам, — вельмі дарагія. Так што мы і тут унеслі значную эканомію ў бюджэт горада, а разам з тым атрымалі выдатны прадмет для гонару.

На базе каледжа працуе аўташкола па падрыхтоўцы ўсіх ахвотных на катэгорыю «В» і перападрыхтоўцы з катэгорыі «В» на «С». Для гэтых мэт ёсць свой аўтадром і аўтатранспарт — легкавы і грузавы. Да паслуг дае магчымасць павысіць заработную плату нашым работнікам і накіраваць сродкі на паляпшэнне матэрыяльнай базы каледжа. У горадзе падрыхтоўку вадзіцеляў ажыццяўляюць каля 70 арганізацый. Сярод вучэбных устаноў па здачы экзаменаў у ДАІ з першага разу наша ўстанова займае годнае чацвёртае месца.

Сталовая ўяўляе сабой лепшыя ўзоры месцаў грамадскага харчавання.

Прыгожа і камфортна ў выкладчыцкім пакоі.

Вялікая ўвага надаецца менавіта практычным заняткам. У некалькіх памяшканнях прадстаўлены асноўныя вузлы аўтамабіляў, дзейныя рухавікі і г.д. Вытворчая лабараторыя падрыхтоўкі аўтаслесараў аснашчана ўсім неабходным абсталяваннем. Тут жа ажыццяўляецца рамонт той тэхнікі, якая ёсць у каледжа.

МЫ СПАРТЫЎНЫЯ

— У Партызанскім раёне сярод устаноў прафесійнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі больш за 15 гадоў менавіта наш каледж з'яўляецца пераможцам круглагадовай спартакіяды — у нас першыя месцы па шэрагу відаў спорту, — тлумачыць **выканаўца абавязкаў кіраўніка фізічнай падрыхтоўкі Мікалай АЎРАМЕНКА,** які працуе ў каледжы вось ужо амаль 25 гадоў і сцвярджае, што тут заўсёды належная ўвага надавалася фізічнаму выхаванню. — Наш навучэнец заняў першае месца па лёгкай атлетыцы ў Беларусі два гады таму. Захоўваем нават кубак ад Міністэрства спорту і турызму. Выпускнікі каледжа — удзельнікі Алімпійскіх гульняў, чэмпіёны свету і Еўропы па розных відах спорту. Займаем першыя і другія месцы па паўэрліфтынгу — сілавым трохбор'і, настольным тэнісе, кросе, баскетболе, валейболе, футболе... У гарадской спартакіядзе ў нас пятае агульнакаманднае месца, прайграем толькі дастойным сапернікам, дзе навучэнцаў значна больш, чым у нас. Запрашаем у якасці выкладчыкаў тых ці іншых секцый нават майстроў спорту. Асабіста я выкладаю паўэрліфтынг... У нас добрая і трэнажорная зала. Прычым трэнажоры зрабіў наш работнік, майстар вытворчага навучання, Уладзімір МАКОЎСКІ.

Выканаўца абавязкаў кіраўніка фізічнай падрыхтоўкі Мікалай АЎРАМЕНКА і выкладчык фізічнай культуры, кіраўнік секцыі па лёгкай атлетыцы Генадзь ШУШКЕВІЧ.

МЫ ВЯДОМЫЯ

Выпускнікамі Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа мантажных і пад'ёмна-транспартных работ з'яўляюцца: старшыня Мінгарвыканкама ў 1989 годзе Станіслаў ЛУКАШЭВІЧ, намеснік Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі ў 2008 годзе Уладзімір ШАФАРЭНКА, суддзя Мінскага гарадскога суда Аляксандр ВАСІЛЕВІЧ, намеснік генеральнага дырэктара МТЗ у 2000 годзе Канстанцін БЛЕШЧЫК, намеснік генеральнага дырэктара ФК «Дынама-Мінск» Віктар АСАДОЎСКІ, салісты групы «Тяни-Толкай» Андрэй ЗАЯЦ і Павел КЛЫШЭЎСКІ, прызёр чэмпіянату свету, удзельнік Алімпійскіх гульняў па лёгкай атлетыцы Яўген МІСЮЛЯ, чэмпіёнка рэспублікі, майстар спорту па лёгкай атлетыцы Настасся СТАРАВОЙТАВА, бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы па паўэрліфтынгу Максім ЯЛОВІК, член зборнай Рэспублікі Беларусь па футболе Сяргей ШПАНЮК, чэмпіён рэспублікі, майстар спорту па лыжных гонках Аляксей ШЫНКАРОЎ і інш.

РАДЫ ЗАПРАСІЦЬ

— Сёння найбольшай папулярнасцю карыстаецца спецыяльнасць «Слесар па рамонце аўтамабіляў; вадзіцель аўтамабіля катэгорыі С», — кажа **член прыёмнай камісіі Людміла АСВЕЦІМСКАЯ.** — Заявы падаюць з рознымі атэстатамі. Будзем спадзявацца, усе стануць нашымі навучэнцамі і застануцца задаволенымі тым, што выбралі наш каледж.

Пасля 9 класаў (тэрмін навучання — 3 гады)

*Электрагазазваршчык; электразваршчык на аўтаматычных і паўаўтаматычных машынах.

*Электрамантажнік па электраабсталяванні, сілавых і асвятляльных сетках.

*Слесар па рамонце аўтамабіляў; вадзіцель аўтамабіля катэгорыі «С».

Пасля 11 класаў

*Машыніст маставога крана; стропальшчык. Тэрмін навучання 1 год.

*Электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання. Тэрмін навучання 1 год.

*Машыніст крана аўтамабільнага; стропальшчык; вадзіцель катэгорыі «С». Тэрмін навучання 1 год 6 месяцаў.

*Вадзіцель аўтамабіля катэгорыі «С» (міжнародныя перавозкі); слесар па рамонце аўтамабіляў. Тэрмін навучання 1 год.

Усе навучэнцы забяспечваюцца:

— бясплатным харчаваннем;

— бясплатнай вучэбнай літаратурай;

— бясплатным спецадзеннем;

— гарантаваным працоўным месцам па заканчэнні каледжа;

— магчымасцю навучання на вадзіцеля катэгорыі «В» і «С».

Член прыёмнай камісіі Людміла АСВЕЦІМСКАЯ кансультуе абітурыентаў.

УРОКІ ВАДЖЭННЯ

Загадчык аддзялення падрыхтоўкі вадзіцеляў Генадзь АЗАРАЎ, майстар вытворчага навучання Леанід САРНАЎСКІ, навучэнец Аляксандр МАТУШ.

— Мы рыхтуем вадзіцеляў па спецыяльнасцях «Машыніст крана аўтамабільнага; стропальшчык; вадзіцель катэгорыі «С», «Слесар па рамонце аўтамабіляў; вадзіцель аўтамабіля катэгорыі «С». «Вадзіцель аўтамабіля катэгорыі «С» (міжнародныя перавозкі), слесар па рамонце аўтамабіляў», — нагадвае **загадчык аддзялення падрыхтоўкі вадзіцеляў Генадзь АЗАРАЎ.** — Сёння ідуць заняткі перападрыхтоўкі з катэгорыі «В» на катэгорыю «С» і падрыхтоўка навучэнцаў па катэгорыі «С». Вы можаце бачыць практычнае ваджэнне на грузавым аўтамабілі будучага аўтаслесара Аляксандра МАТУША. Майстар вытворчага навучання Леанід САРНАЎСКІ праводзіць з кожным курсантам заняткі па 2 гадзіны.

Задзейнічаны ў навучальным працэсе не толькі аўтамабілі, але і гэты аўтакран.

НЯХАЙ МЯНЕ НАВУЧАЦЬ

*Прадстаўніка такой прафесіі, як **электрагазазваршчык,** можна сустрэць на самых розных прадпрыемствах і будоўлях. Ніводная галіна народнай гаспадаркі не можа абысціся без зварачных работ, паколькі зварка з'яўляецца адным з вядучых тэхналагічных працэсаў таго ж машынабудавання і будаўнічай індустрыі.

Прамысловая вытворчасць, навука і тэхніка звязаны са зварачнай вытворчасцю. Развіваецца ўльтрагукавая, лазерная, плазменная зварка.

Электрагазазваршчык выконвае работы па пракладцы і мантажы вода- і газазабеспячэння, сістэм тэхналагічных трубаправодаў на прадпрыемствах, ведае асноўныя тэхналагічныя і вытворчыя працэсы, вартасці матэрыялаў, якія прымяняюцца, тэхналагічную дакументацыю, валодае неабходным інструментам і прыстасаваннямі, выконвае стропальныя і такелажныя работы.

Электрагазазваршчык ажыццяўляе зварачныя работы падчас зваркі металаканструкцый, рамонце абсталявання, пры выкананні будаўнічых работ. Выкарыстоўвае ручную электрадугавую і газавую зварку канструкцый трубаправодаў з рознай сталі, каляровых металаў і сплаваў.

***Электрамантажнік па электраабсталяванні, сілавых і асвятляльных сетках** на вытворчай практыцы і па завяршэнні каледжа выконвае работы на аб'ектах будаўніча-мантажных арганізацый — электрастанцыях, прамысловых прадпрыемствах; ажыццяўляе мантаж другасных ланцугоў. Выконвае таксама работы па разметцы, укладцы і мантажы кабельных трас, мантаж пускарэгулявальнай і сігнальнай апаратуры, шчытоў і пультаў кіравання механізмамі, скрыняў з нізкавольтнай апаратурай, токападводзячых ліній.

***Слесар па рамонце аўтамабіляў, вадзіцель аўтамабіля катэгорыі «С»** рамантуе грузавыя, легкавыя аўтамабілі і аўтобусы. Здымае, разбірае, рамантуе і рэгулюе агрэгаты і вузлы. Падчас рамонту выконвае розныя слясарныя работы. Ажыццяўляе выпрабаванні агрэгатаў, абкатку аўто. Павінен ведаць канструктыўныя асаблівасці аўтамабіляў і агрэгатаў; электрычныя і мантажныя схемы аўтамабіляў; асноўныя віды, вартасці і правілы выкарыстання падчас рамонту электратэхнічных і ізаляцыйных матэрыялаў, вартасці металаў, якія падлягаюць апрацоўцы; метады выяўлення і спосабы выдалення дэфектаў; парадак афармлення прыёмна-здатачнай дакументацыі. Вытворчае навучанне адбываецца ў вучэбных майстэрнях, аўтамабільнай лабараторыі, дыягнастычным цэнтры каледжа і на прадпрыемствах горада.

*Да ліку масавых прафесій у будаўнічым комплексе адносіцца прафесія **машыніста аўтамабільнага крана.** На малапавярховых аб'ектах сельскага будаўніцтва, у месцах камунікацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі аўтамабільны кран з'яўляецца вядучай машынай для выканання мантажных і пагрузачна-разгрузачных работ. На будпляцоўках, дзе вядучай машынай становіцца вежавы кран, аўтакраны выконваюць дапаможныя пагрузачна-разгрузачныя аперацыі, укладваюць штабелі, падаюць матэрыялы на невялікія прыбудовы і г.д.

***Вадзіцель аўтамабіля катэгорыі «С» (міжнародныя перавозкі), слесар па рамонце аўтамабіляў** кіруе адзіночнымі грузавымі аўтамабілямі ўсіх тыпаў і марак катэгорыі «С». Кіруе пад'ёмным механізмам самазвала, помпавай установкай аўтацыстэрны, халадзільнай установкай рэфрыжэратара і іншым абсталяваннем спецаўтамабіляў. Правярае тэхнічны стан і прыём аўтамабіля перад выездам на маршрут. Падае аўтамабілі пад пагрузку і разгрузку грузаў. Забяспечвае захаванне грузу. Выдаляе дробныя эксплуатацыйныя няспраўнасці, якія не патрабуюць разборкі механізмаў. Афармляе пуцявыя дакументы. Рамантуе і збірае дызельныя, спецыяльныя грузавыя аўтамабілі, аўтобусы, імпартныя легкавыя аўтамабілі, грузавыя пікапы і мікрааўтобусы. Разбірае, рамантуе і збірае складаныя агрэгаты, вузлы і прыборы, мяняе іх пры тэхнічным абслугоўванні і інш.

Святлана БАРЫСЕНКА, Аляксандр ФУРСАЎ. Фота Надзеі БУЖАН.

УНП 100420069

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
11 07 2013 г.

«Градус» праблемы

ШТО І ЧАМУ ПАДЛЕТКІ ШУКАЮЦЬ НА ДНЕ ЧАРКІ?

Першую чарку ў жыцці амаль усе выпіваюць яшчэ падлеткамі. Адбыцца гэта можа дзе заўгодна: і ў сям'і падчас святочнай бяседы, і ў кампаніі сяброў, дзе адмаўляцца ад такога «пачастунку» не прынята. Далей падзеі могуць развівацца як заўгодна — тут усё залежыць ад асяродку, у якім выхоўваецца дзяўчына або юнак. Да паўналецця дацягваюць абсалютнымі цвярознікамі толькі самыя моцныя, якія знаходзяць у сабе сілы рашуча сказаць «не», не баючыся перспектывы стаць «белай варонай»...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПЕРШАЕ «ЗНАЁМСТВА»

Чым больш і часцей падлетак спажывае алкаголь, тым вышэйшая ў яго рызыка трапіць да ўрача-нарколага. Але пакуль ён не «засвяціўся» з-за любові да спіртнога ў міліцыі, неабходную медыцынскую і псіхалагічную дапамогу яму акажуць ананімна.

— Падлеткаў, якія трапілі пад нагляд урача-нарколага, у сталіцы зараз каля 5 тысяч. Але гэта не азначае, што ўсе яны пайменна стаяць на ўліку. Большая частка з пацыентаў — гэта дзеці, якіх нападпітку затрымалі супрацоўнікі міліцыі. Дыягназ «хранічны алкагалізм» ставіцца толькі ў адзінкавых выпадках, — расказвае загадчык падлеткавага аддзялення Мінскага гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера **Людміла Шпакоўская.** — Першае знаёмства з чаркай зараз адбываецца прыкладна ў дзесяць-дванаццаць гадоў. Каштуюць амаль усё: піва, гарэлку, віно... У дзевяці з дзесяці выпадкаў першы келіх малому наліваюць бацькі. Матывацыі пры гэтым розныя — адна сям'я нешта святкуе і не хоча, каб хтосьці застаўся ўбаку. Але няўжо, калі дзіця не пакаштуе шампанскага, то Новы год не наступіць? У іншай хочуць такім чынам... загадзя адвучыць падлетка ад спіртнога. Ды толькі такая тактыка можа не спрацаваць, і ўжываць напоі для дарослых ён будзе і потым. І прычына таму простая — алкаголь нават у мінімальнай канцэнтрацыі туманіць малады неакрэплы мозг. У падлетка з'яўляецца адчуванне таго, што з дапамогай «чароўнага зелля» можна на некаторы час адысці ад усіх праблем, на якія багаты пераходны ўзрост: зніжэнне паспяховасці ў школе, расчараванне ў першым каханні, спрэчкі з бацькамі... Пасля да іх паступова дадаюцца разнастайныя праблемы са здароўем. І часта ўсе яны вырашаюцца толькі ў кабінеце нарколага. Тыповы партрэт падлетка, які мае праблемы з алкаголем: ён нічым не цікавіцца, амаль нікуды не ходзіць. «Асартымент» школьных адзнак невялікі — «двойкі», «тройкі», «чацвёркі».

Прыгадваецца гісторыя з 15-гадовым Л. Хлопец расстаўся з дзяўчынай і пачаў «заліваць» гора. Трапіў у п'яным стане ў міліцыю, пасля да нас. Я яму кажу: ну няўжо з-за таго, што ты будзеш піць, дзяўчына да цябе вернецца? Ды не...

Складнікаў у фарміраванні залежнасці ад алкаголю ў падлеткаў шмат. Гэта і спадчыннасць, і стан нервовай сістэмы, і соцыум... Здараецца і так, што бацькі п'юць «не прасыхаючы», а ў іх сына вельмі моцная нервовая сістэма. І ён утрымліваецца ад падзення ў бездань. Быў выпадак, калі школьнік ішоў мыць аўтамашыны, каб пракарміць сваіх бацькоў-п'янчуг. А сам не браў у рот ні кроплі.

ТРАПІЦЬ НА ЎЛІК ПРОСТА. ЗНЯЦЦА ЦЯЖКА...

— У інспекцыі па справах няпоўнагадовых створана адмысловая рэйдавая група, якая пастаянна адпрацоўвае ўлюбёныя месцы збору падлеткаў на «алкагольнае рандэву». Юнака ці дзяўчыну мае права даставіць у РУУС любы супрацоўнік міліцыі, калі бачыць, што той ужо знаходзіцца «пад мухай» ці п'е на вуліцы спіртное. У інспекцыю па справах няпоўнагадовых тэрмінова выклікаюцца бацькі затрыманага, а на маладога чалавека ў гэты час складаецца адміністрацыйны пратакол. Нецвярозы падлетак звычайна парушае два артыкулы Адміністрацыйнага кодэкса, — расказвае інспектар па справах няпоўнагадовых Першамайскага РУУС г. Мінска Дарына Бондар. — Сумную «пальму першынства» ўтрымлівае артыкул 17.3 (распіццё алкагольных, слабаалкагольных напояў ці піва ў грамадскім месцы або з'яўленне на публіцы нападпітку). Калі ж юнака пацягнула на «подзвігі», у тым ліку і папрактыкавацца ўголас у нецэнзурнай лексіцы, то да яго могуць прымяніць і нормы артыкула 17.1 (дробнае хуліганства). А пасля трох і больш канфліктаў з законам — прамы шлях у спецшколу. Пра гэта інспектары расказваюць ва ўсіх навучальных установах. Але ж некаторыя падлеткі не ўспрымаюць такія папярэджанні ўсур'ёз. І пачынаюць думаць толькі тады, калі ўжо трапілі на ўлік. Між іншым, на долю нецвярозых падлеткаў прыпадае прыкладна чвэрць ад усіх злачынстваў, да якіх «прыклалі руку» няпоўнагадовыя парушальнікі.

Здараецца і так, што ў міліцыю прыводзяць і нецвярозых дзяцей. На іх складзі пратакол нельга, бо яны не дасягнулі 16-гадовага ўзросту. Тады аднаго з бацькоў прыцягваюць да адказнасці па артыкуле 9.4 (невыкананне абавязкаў па выхаванні). Пратакол перадаецца ў камісію па справах няпоўнагадовых, і падлетак трапляе на прафілактычны ўлік па месцы жыхарства. А зняцца з яго няпроста. Першы шанц з'явіцца толькі праз паўгода. Ды і то, падлетак мусіць старанна вучыцца, не прагульваць урокі, наведваць урача-нарколага і больш не мець праблем з міліцыяй. Дык ці варта ісці на ўсё гэта дзеля некалькіх гадзін сумніўнага кайфу?

«А ЯКІ ЗАНЯТАК ПА ВЕЧАРАХ У ВАШАГА ДЗІЦЯЦІ?»

Распаўсюджаная ў наш час сітуацыя: бацькі шмат працуюць, і ў іх бракуе часу на выхаванне дзіцяці. Таму яны проста «адкупліваюцца» ад баўлення часу з ім, падарыўшы чарговую электронную цацку. Так малы трапляе ў «залатую клетку», у якой можа атрымаць усё, што захоча. Але пры адной умове — пакуль ён не захоча выбрацца з яе. Гэтая бацькоўская «палітыка» можа працаваць у пачатковай школе, але ў пераходным узросце ляціць пад адхон. Пачынаюцца непаразуменні з педагогамі, са сваякамі — маўляў, я ўжо дарослы, таму магу сам прымаць рашэнні. І самае галоўнае — трэба самасцвердзіцца сярод равеснікаў... Некаторыя бацькі займаюць пазіцыю страуса. Яны лічаць, што бяда можа адбыцца з кім заўгодна, але толькі не з іх дзіцем. Пакуль іх не выкліча на гутарку ўрач-нарколаг...

— Калі падлетак прыйшоў дадому нападпітку, то адразу «выхоўваць» яго бессэнсоўна, — лічыць сацыяльны педагог гімназіі №6 г. Мінска Марына Пазняк. — Яго трэба пакласці спаць і не хапацца назаўтра за папругу, а спачатку сур'ёзна паразмаўляць. Чытаць натацыі сэнсу няма, гэта не падзейнічае. Трэба даведацца ад яго, чаму ён так зрабіў. Вельмі часта гэта сігнал, што ў падлетка ёсць праблемы. Магчыма, яму па вечарах няма чым заняцца. Але каб без усялякай прычыны пайсці і напіцца — так не бывае.

ПАВЯЛІЧЫЦЬ ЦЭНЫ, УЗМАЦНІЦЬ ЗАБАРОНЫ?

На погляд Людмілы Шпакоўскай, выхаду з няпростай сітуацыі магло б паспрыяць рэзкае павышэнне цаны на алкагольныя напоі. Падлеткі грошай не зарабляюць, а бяруць іх у бацькоў. Далёка не кожны прадавец адпусціць малому пітво з градусамі, бо за гэта гандлёвы пункт рызыкуе пазбавіцца ліцэнзіі. Таму падлеткі падыходзяць да дарослых і просяць: «Купі нам піва, а астатняе пакінь сабе на бутэльку». Свядомы чалавек, хутчэй за ўсё, адмовіцца ад такой прапановы. А вось аматар выпіць пагодзіцца з радасцю. І сітуацыя не зменіцца, пакуль тая ж бутэлька піва будзе каштаваць смешныя грошы...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Хуткая дапамога

КАЛІ З ПЫТАННЯМІ НЯЁМКА ІСЦІ ДА БАЦЬКОЎ...

«Ох, ужо гэты пераходны ўзрост!» — часта даводзілася чуць ад бацькоў і настаўнікаў. Сапраўды, падлеткавы ўзрост даволі-такі праблематычны. І далёка не ўсё, што іх хвалюе, юнакі і дзяўчаты могуць абмеркаваць са сваімі бацькамі. І адбываецца гэта не толькі таму, што падлеткам сорамна запытацца пра першыя сексуальныя адносіны, алкаголь ці курэнне... Проста часам, каб даць правільную параду, патрэбна дапамога менавіта спецыяліста.

Для вырашэння гэтай праблемы ў Еўропе былі арганізаваны цэнтры дапамогі падлеткам. Яны могуць змяшчацца пры кінатэатрах альбо нават пры гандлёвых цэнтрах. Такія цэнтры ёсць і ў Беларусі. У нашай краіне іх 46, у тым ліку ў сталіцы — 8. Адзін з іх — Рэспубліканскі інфармацыйны метадычна-рэсурсны цэнтр «Ювентус», створаны ў 2008 годзе ў рамках праекта ўмацавання здароўя падлеткаў» пры падтрымцы Дзіцячага фонду ААН Юнісеф. Галоўная мэта цэнтра — захаванне рэпрадуктыўнага здароўя падлеткаў на аснове прынцыпаў «4Д» — «Даступнасць», «Добраахвотнасць», «Даверлівасць», «Добразычлівасць».

Спецыялісты цэнтра працуюць у шматлікіх кірунках: «Рэпрадуктыўнае здароўе», «Псіхічнае здароўе падлеткаў», «Правільнае харчаванне», «Інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам», «Прафілактыка абортаў», «Уплыў тытуню на здароўе», «Духоўныя каштоўнасці моладзі» і інш.

Дапамога падлеткам можа весціся чатырма спосабамі. Перш за ўсё, гэта індывідуальная дапамога ўрачоў цэнтра. Любы падлетак можа бясплатна атрымаць кансультацыю псіхолага, гінеколага, валеолага.

Таксама шырокай папулярнасцю карыстаецца такі метад, як «Групавая праца» (трэнінгі, «круглыя сталы», псіхалагічная кавярня, прафконсультаванне). Супрацоўнікі цэнтра дамаўляюцца з навучальнымі ўстановамі і тыя накіроўваць падлеткаў у цэнтр. Што цікава, педагогаў, якія прыходзяць з падлеткамі, пасяброўску просяць пакінуць памяшканне. Бо для іх існуюць свае семінары-трэнінгі. Групавыя заняткі — гэта не проста чарговая лекцыя пра здаровы лад жыцця, якія перманентна праводзяць на класных гадзінах у школе, а праца з канкрэтнымі жыццёвымі сітуацыямі. Спецыялісты цэнтра кантактуюць з падлеткамі на роўных, размаўляюць на «іх мове», праводзяць развіваючыя гульні. Напрыклад, трэнінг «Жывая вада» дапамагае падлеткам выявіць комплексы і перамагчы іх. Ёсць звычай: зімой, пасля апошняга занятку, юнакі і дзяўчаты паліваюць кветку, якая расце ў пакойчыку для трэнінгаў, а летам паліваюць ліпу, што расце ў дворыку. Спецыялісты тлумачаць, што кветка або дрэва — сімвал жыцця, і падлеткі такім чынам перадаюць любоў да ўсяго жывога і да сваёй зямлі.

Па кансультацыю да ўрачоў падлеткі звяртаюцца з самымі разнастайнымі праблемамі: гэта і першы сексуальны вопыт, і сямейныя праблемы, і праблемы правільнага прыёму ежы... Але сёння праблема-лідар — гэта ўжыванне наркотыкаў і таксічных рэчываў. У прыватнасці, зараз пайшла мода на «сумесі для курэння». За апошні год у сталіцы ў рэанімацыю трапілі 7 дзяцей, якія пацярпелі менавіта ад такога кшталту сумесяў. Таму абавязкова на занятках расказваюць пра састаў сумесяў і пра тое, што яны могуць трапіцца нават у звычайнай цыгарэце, прапанаванай падлеткам «на кватэры».

У цэнтры можна здаць кроў на ВІЧ-інфекцыю. Урач-валеолаг **Інэса Палазнік** адзначыла: «У нас можна атрымаць кансультацыю перад непасрэднай здачай крыві, бо дагэтуль у некаторых маладых людзей прысутнічае страх перад гэтай працэдурай. Існуе распаўсюджанае меркаванне, што вышэйназваная праблема іх не датычыцца. Але гэта не так. Яна датычыцца ўсіх. Кожнаму трэба ведаць свой статус на ВІЧ-інфекцыю».

«Калі казаць пра цяжкасці, — падзялілася Інэса Аляксандраўна, — то гэта не вельмі актыўнае супрацоўніцтва бацькоў з цэнтрам. Нашы спецыялісты кансультуюць і бацькоў, і падлеткаў. І дзеля гэтага не трэба мець пашпарт, бо ўсё адбываецца ананімна. У нас нават няма рэгістратуры — неабходна проста патэлефанаваць у цэнтр і запісацца на кансультацыю. Таксама хацелася б большага супрацоўніцтва з завучамі па выхаваўчай працы з навучальных устаноў, а не толькі з педагогамі-арганізатарамі, сацыяльнымі педагогамі і псіхолагамі. Хочацца, каб замаўлялі лекцыі альбо заняткі не толькі па стандарце «тытунь-алкаголь-наркотыкі», але закраналі і іншыя вельмі важныя тэмы для падлеткаў: псіхафізічныя асаблівасці, рэпрадуктыўнае здароўе, прафілактыку абортаў, правільнае харчаванне, парушэнні, звязаныя з харчовымі звычкамі».

Урачы адзначылі, што звычайна пасля групавых заняткаў падлеткі падыходзяць, каб атрымаць індывідуальную кансультацыю, бо на форуме сайта цэнтра «Ювентус» не заўсёды пра ўсе канкрэтныя сітуацыі можна спытаць у спецыяліста. А сайт штодня наведвае дастаткова вялікая колькасць маладых людзей. Да слова, сярод наведвальнікаў цэнтра не толькі падлеткі ва ўзросце да 18 гадоў... Па кансультацыю сюды звяртаюцца і маладыя людзі ва ўзросце «за 20»...

Вікторыя ЧАПЛЕВА.

Мой свет | Віртуальныя рэаліі

РАМОНКІ АД НЕЗНАЁМЦА

Букет рамонкаў. Проста так. Ад незнаёмца. Прыемна. Калі з раніцы настрой быў дрэнны, то зараз ён умомант падняўся... Незнаёмец? З ім кожны дзень перахо-дзім вуліцу ў адзін і той жа час. Не ведаю, як зваць, але ведаю, што такіх хлопцаў рэдка сустрэнеш.

З дзяцінства мне казалі, што я маю вялікі рост... Наколькі ўсе памыляліся, я зразумела, калі аднойчы ў чаканні зялёнага колеру не спыніўся каля мяне «Дядзька Сцёпа» XXI стагоддзя. Вышэй за мяне ці не на тры галавы. З «вялікімі вачыма» я крочыла па вуліцы, назіраючы, як ён, не спяшаючыся, ідзе. У той дзень я даведалася аб выніках абавязковай кантрольнай. Радасці не было канца. Дзень прайшоў на пазітыве.

Раніца. Пешаходны пераход. Чаканне. Ад неспадзявання я ледзь утрымалася на нагах. Двухметровы юнак зноў побач. Нават усміхнуўся, калі я са здзіўленнем на яго паглядзела. Ямачкі на шчоках. На занятках я толькі тым і займалася, што марыла.

Выхадны дзень. Спяшаюся ў бібліятэку. Поўнасцю паглыбілася ў думкі. Нікога не заўважаю побач. Перад маім тварам дзверы адчыняюцца, я нават не паспела працягнуць руку сама. Праз некалькі хвілін да мяне дахо-дзіць тое, што адбылося: сустрэла джэнтльмена і нават не падзякавала яму. Азіраюся. Ну проста неверагодна! Зноў ён.

Панядзелак. Пешаходны пераход. Не ведаю чаму, але юнака я не ўбачыла. Пасля заняткаў даведалася, што мая бабуля захварэла. Сэрца ў пяткі. Павышаны ціск. Настрой знік зусім. Вечарам было цяжка заснуць, як ні старалася.

Зноў раніца. Без усмешкі. Няма і майго незнаёмца. Перажываю, як ні дзіўна.

Першая думка, калі прачнулася: спазняюся. Вось табе і спорт раніцай, як марыла! Аднак у святлафора іншыя, напэўна, думкі наконт гэтага. Спыніся. Паразважай пра жыццё. Аднекуль з'явіўся водар кветак. І зноў, як з-пад зямлі, вырас юнак. Мне стала спакайней на душы. Працягвае букет:

— Усміхніся! Гэта табе да твару!

Ніколі раней мне не прыходзілася сустракаць хлопцаў, якія размаўляюць па-беларуску. Мяне здзівіла гэта не менш, чым букет рамонкаў. Проста так. Ад незнаёмца. Прыемна.

Гэты хлопец прыносіць мне спакой. Калі мы перахо-дзім вуліцу разам — у мяне будзе выдатны дзень, калі не — нешта пойдзе не так. Ён стаў часткай майго жыцця. І кожны дзень, стоячы на пераходзе, я ў думках варажу на рамонках: прыйдзе ці не прыйдзе?..

Кацярына ЛЯСУН.

КІБЕРСПОРТ: РАЗВІВАЦЬ ЦІ ЗАБАРАНЯЦЬ?

Кіберспорт, або камп'ютарны спорт — моладзевы від спорту, заснаваны на спаборніцтвах па камп'ютарных гульнях. Як і ў традыцыйных відах спорту, гульцы і каманды выступаюць на прафесійным, паўпрафесійным і аматарскім узроўнях. Сёння кіберспорт мае статус афіцыйнага ў некалькіх краінах свету і працягвае заваёўваць пазіцыі. Але разам з тым узрастае і шэраг супярэчнасцяў, што яго датычацца.

«ЗА» І «СУПРАЦЬ»

Камп'ютарныя спаборніцтвы праводзяцца па ўсім свеце, у тым ліку і міжнародныя. А пачалося ўсё з выхаду культавай гульні Doom, якая дала магчымасць удзельнічаць у ёй адначасова мноству геймераў, падключаных да лакальнай сеткі ці да інтэрнэту, у рэжыме рэальнага часу. Вылілася ўсё гэта ў стварэнне першай «афіцыйнай» кіберспартыўнай арганізацыі — у 1997 годзе ў ЗША з'явілася федэрацыя кіберспартсменаў Cyberathlete Professional League (CPL).

З тых часоў пытанне аб прызнанні спаборніцтваў па камп'ютарных гульнях сапраўдным відам спорту паўстае рэгулярна. На карысць прыводзіцца мноства аргументаў: гэта і правядзенне, як у любым іншым відзе спорту, адборачных тураў напярэдадні, і жорсткі рэгламент, і наяўнасць шэрагу кіберспартыўных дысцыплін, і ўзнагароды, і нават міжнародны фармат правядзення некаторых спаборніцтваў. Але пакуль што ў свядомасці значнай часткі грамадства пры ўзгадванні спорту ўзнікаюць зусім іншыя асацыяцыі, далёкія ад камп'ютарных гульняў. З іншага боку, не ўсе могуць зразумець, чаму шахматы — таксама спорт?

ПАСПЯШАЛІСЯ З ПРЫЗНАННЕМ

Тым не менш ёсць краіны, дзе камп'ютарныя спаборніцтвы вітаюцца на самым высокім узроўні. Напрыклад, у Карэі адна з дысцыплін (а менавіта StarCraft: Brood War) была прызнана нацыянальным відам спорту.

Паспрабавала паказаць сябе перадавой краінай і Расія. 22 сакавіка 2001 года ў нашых суседзяў была зарэгістравана Федэрацыя камп'ютарнага спорту Расіі. А ў 2004 годзе Расійская Федэрацыя стала першай краінай, якая прызнала камп'ютарныя спаборніцтвы афіцыйным відам спорту. Але музыка грала нядоўга: праз колькі гадоў кіберспорт быў выключаны з Усерасійскага рэестра відаў спорту з той прычыны, што ён не адпавядаў неабходным для знаходжання ў рэестры крытэрыям. Але гэта не перашкаджае кіберспорту прысутнічаць у пераліку відаў спорту для ўвядзення ў дзяржаўныя праграмы фізічнага выхавання насельніцтва.

ПРЫВІД БЕЛАРУСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ

На прасторах інтэрнэту можна знайсці нямала спрэчак паміж геймерамі наконт таго, ці існуе ў Беларусі такая з'ява, як кіберспорт. Аднак пры ўсім жаданні прагрэс не можа абыходзіць бокам нашу краіну — у Беларусі ўжо налічваецца больш за 10 тысяч прыхільнікаў камп'ютарных бітваў.

Сёлета ў красавіку першы сакратар ЦК БРСМ Ігар Бузоўскі заявіў пра магчымасць стварэння ў Беларусі федэрацыі кіберспорту. Цікава, што такая арганізацыя ўжо была створана раней. Беларуская федэрацыя камп'ютарнага спорту зарэгістравана яшчэ 23 ліпеня 2002 года пры падтрымцы міністэрстваў спорту і турызму, інфармацыі, адукацыі, шэрагу камп'ютарных клубаў і іншых арганізацый. Федэрацыя мела за мэту садзейнічанне развіццю вышэйназванага віду спаборніцтваў. Але на сённяшні дзень БФКС не выяўляе ніякіх прыкмет свайго існавання. І кіберспорт у нашай краіне развіваецца дзякуючы прыватным намаганням. У Беларусі адзіным яго папулярызатарам называе сябе ініцыятыва TechLabs Cup CIS, якая займаецца арганізацыяй буйнейшай IT-падзеі на прасторы СНД — Міжнароднага кіберфестывалю TECHLABS CUP. Фестываль праходзіць у Беларусі, Казахстане, Расіі і Украіне, а таксама прываблівае гасцей з краін Усходняй і Заходняй Еўропы і ЗША. Сёлета фінал TECHLABS CUP BY 2013 прайшоў у Мінску 18 мая, сабраўшы каля васьмі тысяч гледачоў.

Фота Надзеі БУЖАН.

Чалавек выдаткоўвае ўсё больш часу на гульню, спыненне якой выклікае ў яго «сіндром адмены», што суправаджаецца раздражнёнасцю, непакоем, дэпрэсіяй, жаданнем зноў паглыбіцца ў віртуальны свет, каб пазбавіцца негатыўных адчуванняў.

«РАЗВІВАЕЦЦА, АЛЕ АДСТАЕ»

Дырэктар TechLabs Cup CIS Аляксей Бурдыка кажа, што ўзровень беларускага кіберспорту ў параўнанні з украінскім і расійскім пакуль што адстае.

Пакуль што ў свядомасці значнай часткі грамадства пры ўзгадванні спорту ўзнікаюць зусім іншыя асацыяцыі, далёкія ад камп'ютарных гульняў.

— У нас нашмат менш прафесійных камандаў, менш спонсараў. Ёсць, вядома, камп'ютарныя клубы, але магчымасць дакрануцца да камп'ютарнага спорту не толькі прафесіяналам, але і аматарам дае толькі TECHLABS CUP.

Па словах Аляксея Бурдыкі, падчас арганізацыі фестываляў нярэдка ўзнікаюць праблемы з адміністратыўным рэсурсам, таму што не ўсе разумеюць, што такое кіберспорт. Але сёлета мерапрыемства ўпершыню атрымала дзяржаўную падтрымку з боку БРСМ, і арганізатары спадзяюцца на далейшае з ім супрацоўніцтва.

Малады беларускі кіберспартсмен Кірыл Качынскі кажа, што камп'ютарны спорт у Беларусі прагрэсуе. Па словах Кірыла, калі раней увогуле не было ніякіх «штуршкоў», то зараз паступова з'яўляюцца новыя гульцы і каманды. На «прафесійнай» геймерскай «сцэне» ён ужо каля года, а ўвогуле гуляе сем гадоў. Кірыл неаднаразова ўдзельнічаў у TECHLABS CUP на чале беларускай каманды Power Rangers, якая летась перамагла на фестывалі і атрымала магчымасць паехаць на спаборніцтвы ў Кітай.

Малады кібератлет упэўнены, што з часам гульня перастае быць проста захапленнем, а дае магчымасць нечага дасягнуць, паглядзець свет і паказаць свету сябе. Такая вось магчымасць самасцвярджэння. А таксама новая форма стасункаў паміж людзьмі.

— Для мяне гэта хобі, — тлумачыць Кірыл. — Мне прыемна бавіць час з сябрамі такім чынам. Хоць у кожнага тут свае мэты: нехта хоча дасягнуць высокіх вынікаў, а нехта — зарабіць грошай.

Хлопец спадзяецца вывесці сваё захапленне ў ранг прафесійнага занятку.

— Хацелася б звязаць жыццё з DOTA II (камп'ютарная камандная гульня. — **Аўт.**). Мне цяпер 17 гадоў, гэта такі ўзрост, калі можна «ўзяць» яшчэ шмат вяршыняў у кіберспорце.

АД ГУЛЬНІ ДА ХВАРОБЫ...

Вядома, у кожнага чалавека свае захапленні і сферы, дзе ён мае магчымасць сябе праявіць. Безумоўна, наяўнасць любімай справы надае сэнс жыццю. Але калі гэткай справай становяцца камп'ютарныя гульні, мала хто можа стрымацца, каб не назваць захапленне хваробай. Вось і Кірыл Качынскі з сумам распавядае:

— Самая вялікая праблема ў тым, што бацькі большасці гульцоў не падтрымліваюць іх захапленне, маўляў, тыя па дзесяць гадзін за суткі сядзяць за камп'ютарамі.

Сапраўды, праблема камп'ютарнай залежнасці сярод моладзі паўстае ўсё больш востра. Сёння нават двух- і трохгадовыя дзеці ўпраўляюцца з тэхнікай на «раз — два» і, вядома ж, не абмінаюць увагай відэагульні.

У дырэктара TechLabs Cup CIS Аляксея Бурдыкі на гэты конт ёсць сваё меркаванне:

— Безумоўна, гэта праблема, калі дзіця дзесяць гадзін запар гуляе ў камп'ютарныя гульні. І яго нічога не цікавіць, акрамя гульняў. Выснова, якая напрошваецца — перад вамі чалавек залежны. Але можна задацца пытаннем: што робяць бацькі, калі дзіця трапляе ў залежнасць ад камп'ютара? Чаму яны не развіваюць дзіця ў іншых напрамках, не абмяжоўваюць яго, надаюць яму мала ўвагі? Камп'ютарныя гульні — гэта такая ж частка нашага паўсядзённага жыцця, як прагляд тэлевізара ці гульні ў двары. Але толькі частка...

АМАЛЬ ШТО НАРКОТЫК

Псіхолаг Андрэй Чарняўскі каментуе з'яву кіберспорту з прафесіянальнага пункту гледжання.

— Залежнасць — гэта назойлівая патрэба ў пэўных дзеяннях, нягледзячы на несприяльныя наступствы медыцынскага, псіхалагічнага ці сацыяльнага характару. У аснове кіберспорту — залежнасць ад камп'ютарных гульняў, якая фарміруецца дастаткова хутка і блізкая да наркатычнай залежнасці. Чалавек выдаткоўвае ўсё больш часу на гульню, спыненне якой выклікае ў яго «сіндром адмены», што суправаджаецца раздражнёнасцю, непакоем, дэпрэсіяй, жаданнем зноў паглыбіцца ў віртуальны свет, каб пазбавіцца негатыўных адчуванняў.

Чаму мы не гаворым пра залежнасць ад «традыцыйнага» спорту, калі чалавек гадзінамі займаецца ў спартзале? Справа ў тым, што ў гэтым выпадку чалавек не мае ідэі «фікс» ісці ў спартзалу. Гэта, хутчэй, свядомае рашэнне, у цэнтры якога — пэўная мэта. Часта неабходна перамагчы самога сябе, прымусіць наведваць спартыўную секцыю, тым самым абмяжоўваючы сябе ў іншых занятках і ў асабістым часе. Спорт не з'яўляецца залежнасцю, таму што кінуць трэніроўкі не ўяўляе цяжкасці. А сапраўдная залежнасць мае на ўвазе немагчымасць адмаўлення ад чагосьці. Таму кіберспорт, на маю думку, нічога агульнага з сапраўдным спортам не мае.

У адрозненне ад «звычайнага», камп'ютарны спорт не развівае арганізм ні фізічна, ні інтэлектуальна. Наадварот, даказана, што захапленне камп'ютарнымі гульнямі стрымлівае інтэлектуальнае развіццё.

Сёння палеміка аб тым, ці з'яўляецца кіберспорт залежнасцю, працягваецца. Але ёсць крытэрыі, па якіх можна вызначыць, ці залежыць чалавек ад камп'ютара. Гэта нежаданне адарвацца ад работы ці гульні за камп'ютарам, раздражненне пры прымусовым яго адключэнні, немагчымасць спланаваць заканчэнне сеанса работы ці гульні за камп'ютарам, ігнараванне хатніх спраў, службовых абавязкаў, вучобы падчас гульні, пагарджанне ўласным здароўем, гігіенай і сном на карысць камп'ютара і гэтак далей.

Пры наяўнасці вышэйзгаданых сімптомаў можна гаварыць аб залежнасці. Ёсць шэраг прыкладаў таго, як людзі паміралі за камп'ютарам ці забівалі блізкіх з-за таго, што тыя забаранялі ім гуляць, не кажучы ўжо аб іх няздольнасці да нармальнага існавання ў грамадстве. Таму, напрыклад, бацькам неабходна ведаць, што камп'ютарная залежнасць фарміруецца тым хутчэй, чым раней дзіця пачынае бавіць час перад маніторам. У працэсе развіцця дзіця праходзіць паслядоўныя стадыі, для кожнай з якіх характэрны свой від дзейнасці: для дашкольніка — традыцыйная гульня з аднагодкамі, для малодшага школьніка — вучэбная дзейнасць, для падлетка — актыўныя стасункі з равеснікамі. Калі падмяніць гэтыя стадыі гульнёй на камп'ютары, то дзіця будзе мець псіхалагічныя праблемы, што прывядзе да сацыяльнай дэзадаптацыі. Таму часта віна за гульнявую залежнасць дзяцей кладзецца на саміх бацькоў, якія камп'ютарам падмяняюць працэс выхавання. Для дзяцей 6-7-гадовага ўзросту час знаходжання за камп'ютарам не павінен перавышаць 10 хвілін, для дзяцей 8-11 гадоў — 15-20 хвілін, а для падлеткаў дастаткова 30 хвілін.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
11 07 2013 г.

SEX–БАЛЯСЫ

НЕ СЛЯПІЦЕ, МІНАКІ, ПАШКАДУЙЦЕ!

«Дапамажыце! Хуліганы зроку пазбаўляюць!» Памятаеце гэтую фразу са славутай савецкай камедыі? Гэта калі «Дацэнт» заклікае «па паняццях» да парадку Міколу Піцерскага. Дык вось тое ж самае зараз можна казаць кожны дзень, выходзячы з дому. «Маргалы выкалаць» гатовы ці не кожны другі мінак. Не «казой» з пальцаў, а сваім знешнім выглядам. Прычым я гавару зусім не пра аголенасць асобных нашых грамадзян і найперш грамадзянак, дакладней, не пра ступень гэтай самай аголенасці.

Чалавек, як вядома, істота недасканалая. Іншымі словамі, што б ні адбывалася, ён заўсёды нечым незадаволены. Давайце будзем шчырымі: лета мы чакаем, як манну нябесную, дзевяць месяцаў на год. Таму даруем адно аднаму сапраўды часам залішне глыбокія дэкальтэ і кароценькія спаднічкі і шорцікі, прынамсі, робім хаця б выгляд, што ўсё ў межах нормы. Ну спёка ж! Ды і прыгожа, як правіла. Я кажу зараз зусім пра іншае, што не заўважыць ну ніяк не атрымліваецца пры ўсім жаданні, што вельмі часам кідаецца ў вочы — пра недарэчнасці ў адзенні. Пра тое, што прыгожым быць не можа.

...У 1990-х гадах хадзіў такі жарт — пародыя на рэкламу: кожны шахцёр ведае, што белае і тое, што абцягвае, у забой не апранаюць... А цяпер і жук, і жаба лічаць, што ім аднолькава пасуе нешта моднае, не зважаючы на ўласныя габарыты і асаблівасці фігуры. Дзяўчаты, вядома, ідуць на гэта дзеля прыцягнення ўвагі супрацьлеглага полу. Толькі эфект часам можа быць зусім іншы. Як у тым анекдоце. На прыпынку грамадскага транспарту стаіць дзяўчына ў вельмі вузкіх джынсах. Хлопец-мінак, пабачыўшы яе, са здзіўленнем пытаецца: «Як можна папасці ў такія вузкія штаны?» — «Спачатку — у рэстаран!».

Які рэстаран, ты сябе збоку бачыла? Уяўляеш сабе лапкі павучка? Дык твае — танчэйшыя! Табе б, мая харошая, прыкрыць іх чым-небудзь, а не выстаўляць на ўсеагульны агляд. Ну, ды гэта яшчэ такі цнатлівы варыянт.

Каўбасныя вырабы, перацягнутыя шпагатам, усе бачылі? Здагадваецеся, пра што я? Ідзе папарадзе цябе дзяўчына, як той казаў, у целе. А цябе не пакідае ўражанне, прабачце, што бачыш «сасіску», бо яна літаральна спавіта рознымі бачнымі і нябачнымі дэталямі адзення. І гэта, як правіла, на фоне аголенасці цела. Ну сапраўды, як жа без аголенасці? Скажыце, чаму я павінен атрымліваць вывіх зроку? Няўжо чалавек сам не разумее, што так — не-пры-го-жа! Так, лета, так, горача. Але ці нельга апрануцца адначасова і па надвор'і, і каб іншым настрой не псаваць сваім выглядам? А бывае, кабета, наадварот, такую хламіду на сябе накіне... Мудрагелісты такі прыёмчык, як у анекдоце: «Тоўстая, але хітрая дзяўчынка насіла адзенне на некалькі памераў большае, каб усе думалі, што яна пахудзела». Дык гэта ў анекдоце сітуацыя смешная, а ў жыцці — наадварот.

Нядаўна ў інтэрнэце абмяркоўвалі фотаздымак маладой мамы з малым дзіцем. Дзіця ў шорціках, сандаліках і панамачцы. Жанчына — у купальніку і шлёпках. Усё б нічога, толькі фатограф зняў маці з дзіцем не на беразе ракі, нават не на пустой вясковай вуліцы, а... на праспекце. Не цэнтр горада, праўда, але месца даволі публічнае. І купальнік на фотаздымку глядзеўся, як звычайная ніжняя бялізна... Ці прыемна было выпадковым мінакам назіраць гэту «карціну маслам», як думаеце?..

Грашыць гэтым і моцны пол. Юнакі з голым торсам і ў шортах у цэнтры горада — звыклая з'ява. Звыклая, але зусім не прыгожая. Нават патлумачыць цяжка, чаму... Для пляжу, для адпачынку на ўласным падворку — самае тое. А вось шорты, шлёпанцы і аголены торс на фоне офісных будынкаў, мноства машын, людзей і расплаўленага асфальту — зусім не камільфо. Ну, прыкладна так, як у лазню ў гарнітуры зайсці. Увогуле, мужчынскія шорты — асобная «песня».

Не ведаю, як каму, а мне смешна бачыць брутальных мужчын у шортах, як той казаў, «вясёленькага» колеру. Ці з малюначкамі кшталту мульцяшных герояў. Уражанне, што нехта, дапамагаючы выбраць такі прадмет адзення, вельмі хацеў чалавеку адпомсціць... Яшчэ ёсць шорты-«матрасікі». Ніжэй за калена, расфарбоўка — як у велізарных кайстраў «чаўнакоў» некалі. Знізу — нязменныя шлёпкі, зверху — такі ж нязменны «піўны» жывоцік. Майка (добра, калі не «алкагалічка»), барсетка ў рукі (ну як гэта: у шортах-«матрасіках» ды без любімай барсеткі?) — гатовы чарговы летні тыпаж. Ці прыгожы? Спрэчнае пытанне...

Ну і як яшчэ колькі слоў не сказаць пра загар? Як дапаўненне да ўсяго астатняга. Мужчыны не часта ім злоўжываюць, а вось жанчыны, дзяўчаты... Бывае, пабачыш здалёк такую «галавешку», першая думка — шахцёр з забою вяртаецца. Як мы ўжо памятаем, у белым і ў тым, што абцягвае. Тут дарэчы будзе яшчэ адзін анекдот прыгадаць. «Дарагі, дай грошай на салярый» — «На цябе і так ужо скінхеды пачалі азірацца!». Не буду пераказваць відавочнае пра небяспеку такога загару, папросту нагадаю, што ва ўсім лепш захоўваць меру.

...Не паспеем азірнуцца, як лета скончыцца. Застануцца толькі ўспаміны. І чаканне чарговага сезона. Таму давайце проста радавацца таму, што маем зараз: сонцу, цеплыні, загарэлым целам, лёгкай эротыцы ў адзенні. Няхай гэта ўсё разам узятае будзе толькі прыгожым і радуе вока!

Фота Надзеі БУЖАН.

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Калі гэта патрэбна для ролі, я магу стаць невыноснай»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— У вас творчае сямейнае акружэнне...

— Муж у мяне таксама акцёр — Раман Падаляка, ён працуе ў Купалаўскім тэатры. І ў нас не бывае непаразуменняў, бо мы абое разумеем, што прафесія забірае шмат сіл, і часам трэба проста адпачыць, памаўчаць. Мая маці, Анжаліка Дайняк — рэжысёр тэлебачання, але зараз працуе на радыё, — прывіла мне любоў да кіно. Яна вельмі любіць гэтую сферу і выступае за маю рознабаковую занятасць на працы, бо лічыць, што пакуль не дасягнуты пэўны ўзрост, варта рэпецірваць, граць, здымацца. Бабуля мая, Лідзія Васільеўна, заядлая тэатралка. У дзяцінстве яна вадзіла мяне на драматычныя спектаклі і на балет. А зараз не прапускае ніводнага майго спектакля. Сябры ў асноўным таксама з тэатра ці тыя, з кім мы вучыліся разам у Акадэміі.

— Даводзілася сустракацца з нядобразычлівасцю?

— Імкнуся ніколі не канцэнтраваць сваю ўвагу на такіх момантах. Магчыма, таму і не заўважаю, нават калі яны і прысутнічаюць. Я думаю, што нядобразычлівасць бывае, бо нельга быць чалавекам, які ўсім падабаецца і якога ўсе любяць. Нядобразычлівасцю можа быць проста праява эмоцый, настрою, а нехта, магчыма, і сапраўды так ставіцца да цябе, аднак гэта сведчыць толькі пра тое, што мы розныя.

— У вас існуюць нейкія крытэрыі пры выбары роляў?

— Маё правіла — калі праца добрая, то адмаўляцца ад яе не варта. Нават калі роля не заўсёды супадае з табой. Раней, падчас вучобы ў Акадэміі мастацтваў, на чацвёртым курсе я адхіліла дзве прапановы. Аналізуючы сёння тую сітуацыю, разумею, што не згадзіцца было нармальна і правільна. Як тады, так і зараз я адмовілася б. Новая роля — новы этап у жыцці, але калі я не гатова, напрыклад, паехаць на здымкі на паўтара года і жыць увесь гэты час у іншым горадзе, то ніякія грошы мяне не пераканаюць зрабіць гэта.

Новая роля — новы этап у жыцці, але калі я не гатова, напрыклад, паехаць на здымкі на паўтара года і жыць увесь гэты час у іншым горадзе, то ніякія грошы мяне не пераканаюць зрабіць гэта.

— Тэатральную сцэну і кінапляцоўку ўспрымаеце па-рознаму?

— Кіно і тэатр патрабуюць рознай тваёй аддачы. Мне часта задаюць гэтае пытанне... Я нідзе не адчуваю сябе нязручна. На тэлебачанні, напрыклад, іншая спецыфіка, з якою я не сутыкалася ў кіно і тэатры. Там складана ў тым плане, што няма магчымасці поўнасцю выявіць сябе эмацыянальна, не трэба ствараць нейкі вобраз. Ты павінен заставацца самім сабой. Гэта адначасова і складана, і проста.

— Праграма «Чакай мяне» — эпіцэнтр чалавечых перажыванняў. Складана кантраляваць сябе і свае эмоцыі?

— Кантроль прысутнічае, таму што ты знаходзішся на здымках і трымаеш у галаве сцэнарый. Ён, безумоўна, прыблізны, бо нельга спрагназаваць рэакцыю гасцей у студыі. Трэба памятаць і ведаць імёны і прозвішчы ўсіх прысутных, умець супакоіць іх. Трэба трымаць сітуацыю пад кантролем, каб самой не расплакацца.

— Які вопыт дае вам праграма?

— Непасрэдны кантакт з людзьмі. Калі бачу іх жыццё, іх хваляванні ў студыі, я, здаецца, станаўлюся больш памяркоўнай і разумею: усе мы з аднаго «цеста». Я люблю людзей і заўсёды радуюся магчымасці нечым ім дапамагчы. А на праграме маю шанц рэалізоўваць сваё імкненне быць карыснай.

Алена ДРАПКО.

Сеціва

МЕНШ ДАРОСЛЫХ — МЕНШ ПРАБЛЕМ?

Як паказала новае даследаванне анлайн-паводзін амерыканскіх падлеткаў, тыя ўсё больш актыўна выкарыстоўваць Twitter і Instagram замест Facebook, паколькі ў Facebook іх не задавальняе прысутнасць вялікай колькасці дарослых і непатрэбнай інфармацыі. У параўнанні з 2011 годам выкарыстанне падлеткамі Twitter выросла на 8%.

У ходзе апытання высветлілася, што 94% падлеткаў маюць профіль на Facebook. Facebook па-ранейшаму застаецца папулярнай сацыяльнай сеткай, паколькі зносіны там з'яўляюцца важным момантам падлеткавай сацыялізацыі. Аднак большасць апытаных адказалі, што вельмі ўважліва ставяцца да настроек канфідэнцыяльнасці сваёй старонкі, і іх профілі закрыты для старонніх людзей. Яны робяць таксама і іншыя захады, каб абараніць сваю рэпутацыю: 74% падлеткаў хаця б раз выдалялі непажаданых асоб са спіса сваіх кантактаў, 59% выдалялі або рэдагавалі свае старыя запісы, 45% выдалялі спасылкі са сваім імем на фотаздымках, дзе іх адзначалі іншыя, а 19% шкадавалі аб пакінутым каментарыі, запісе, размяшчэнні фота або відэа. Цікава, што ў той час, як большасць падлеткаў закрываюць свае профілі на Facebook, іх акаўнты ў Twitter застаюцца публічнымі. Прычым падлеткі размяшчаюць у інтэрнэце сёння нашмат больш інфармацыі пра сябе, чым раней: 91% апытаных публікуюць свае фота, 71% указваюць назву сваёй навучальнай установы, 71% указваюць населены пункт. Свой адрас публічна ўказваюць 53%, а 20% не робяць тайны з нумара свайго тэлефона. Між іншым, у 2006 годзе свой нумар тэлефона ўказвалі ў сацыяльных сетках толькі 2% падлеткаў, а адрас — 29%.

Новай для даследчыкаў стала выснова пра тое, што больш чым палова падлеткаў, якія вядуць актыўнае жыццё ў сацыяльных сетках (57%), баяцца размяшчаць у сацыяльных сетках нейкую інфармацыю, таму што хвалююцца, што ў будучыні гэта можа аказаць ім дрэнную паслугу.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.
Адрас рэдакцыі:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 24.012.
Нумар падпісаны ў 19.30 10.07.2013 г.

Першыя беларускія экскаватары пайшлі ў серыю, або Чарговая перамога калектыву ААТ «Жлобінскі механічны завод «ДНЕПР»

На мітынгу з нагоды пуску ў эксплуатацыю цэха № 3 і серыйнай вытворчасці экскаватараў.

Візітоўка прадпрыемства

Вось ужо 46 гадоў ААТ «Жлобінскі механічны завод «DNEPR» з'яўляецца адным з лідараў па вытворчасці і пастаўцы металічных вырабаў у Рэспубліцы Беларусь (сёння ў яго — другое месца). З часу свайго існавання ён называўся па-рознаму і спецыялізаваўся на капітальным рамонце бульдозераў і экскаватараў, вытворчасці нестандартнага абсталявання, інвентару, сродкаў малой механізацыі.

Калі адзіная краіна СССР распалася на асобныя рэспублікі і гэта выклікала ўсім вядомыя цяжкасці, заводу ўдалося захаваць асноўныя кадры. А калі сітуацыя стабілізавалася, калектыў прыйшоў да высновы, што яму па сілах не толькі аснашчаць экскаватары з розных краін усім неабходным, але і наладзіць выраб іх на сваім прадпрыемстве. Гэта была занадта смелая, а можа, нават і рызыкоўная задума, бо ў нашай рэспубліцы вышэйназваная магутная тэхніка ніколі не выпускалася, а ў Савецкім Саюзе было толькі адно такое прадпрыемства ў горадзе Іванава.

Тым не менш у 2010 годзе мы, пераадольваючы шматлікія цяжкасці, вырабілі першы экзэмпляр гідраўлічнага экскаватара DNEPR ET 2301. Зборка яго вялася з машынакамплектаў, якія пастаўляў кітайскі бок. У камплектацыі машыны былі задзейнічаны фірмы Германіі, Італіі, Карэі. Нашых айчынных складнікаў у ёй налічвалася ўсяго 10 працэнтаў. Але гэта быў толькі пачатак, бо ў наступныя гады прадпрыемства, вобразна кажучы, напружыла свае мускулы, праявіўшы велізарнае старанне, творчы падыход да справы, высокі прафесіяналізм ІТР і рабочых. І ў выніку з'явіўся ўжо новы экскаватар, у якім беларускіх складнікаў было куды больш — 67 працэнтаў. Пасля гэтага экскаватар DNEPR ET 2301 на гусенічным ходзе быў запушчаны ў серыю, і ў сёлетнім чэрвені «нарадзіліся» яшчэ дзве машыны. Перамога! Іншай ацэнкі поспеху жлобінцаў быць не можа!

Экскаватар — наша асаблівая гордасць, і гэта адзін з галоўных кірункаў дзейнасці прадпрыемства. А ёсць жа і іншыя кірункі, якія таксама з'яўляюцца вельмі важнымі. Напрыклад, выраб будаўнічых металаканструкцый, які дасягнуў звыш адной тысячы тон у год (і гэтая лічба вышэй, чым была яна ў савецкія часы). Або вытворчасць металаформаў для заводаў жалезабетонных вырабаў. Гэта экспартны тавар у аб'ёме 15 працэнтаў аб'ёмаў прадпрыемства. Галоўныя заказчыкі яго — у Смаленскай, Калужскай, Ліпецкай, Яраслаўскай, Бранскай, Арлоўскай абласцях Расіі. Нельга не сказаць і пра супрацоўніцтва прадпрыемства са здабытчыкамі «чорнага золата» і вытворцамі сейсматэхнікі, для якіх пастаўляецца вялікі спектр нафтапрамысловага і іншага абсталявання.

Нам неаднаразова даводзілася наведвацца ў Жлобінскі раён, расказваць аб працоўных справах і Беларускага металургічнага завода, і швейнай фабрыкі, і КЖУП «Уніком», і мясакамбіната, і ААТ «БелФА», і будаўніча-мантажнага трэста № 40, і прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу. Асобным радком у гэтых сустрэчах можна лічыць камандзіроўкі на завод, які яшчэ ў 2011 годзе называўся рамонтна-механічным, а ўжо ў наступным быў перайменаваны ў механічны завод «ДНЕПР». Чаму асобным? Таму што нам пашчасціла быць сведкамі таго (і гэта знайшло адлюстраванне на старонках газеты), як апошнім часам прадпрыемства ўзяло такі разгон і такую смеласць на сябе, што замахнулася на вялікае і прэстыжнае — выпуск тэхнікі, якая раней не выраблялася ў Беларусі. Размова ідзе пра гідраўлічны экскаватар DNEPR ET 2301. І замах той атрымаўся! Першыя беларускія экскаватары пайшлі ў серыю, з нагоды чаго мы гутарым з дырэктарам прадпрыемства Ігарам НІКІЦІНЫМ.

Дырэктар Ігар НІКІЦІН.

Каманда

— Ігар Кірылавіч, на завод вы прыйшлі ў 2001 годзе, а ў 2008-м узначалілі яго. Скажыце шчыра, ці меркавалі вы тады, што праз такі кароткі тэрмін калектыў возьме вышыню, якая на той час здавалася недасягальнай?

— Шчыра прызнаюся, што не думаў аб гэтым.

— А ці праўда, што вы не карысталіся дзяржаўнай матэрыяльнай падтрымкай, што ўсе фінансавыя сродкі былі ўзяты з «кішэні» свайго прадпрыемства?

— Праўда. Рознага кшталту падтрымку мы адчувалі з боку абласнога і раённага выканаўчага камітэтаў, Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, Саюза будаўнікоў. А вось грошы былі свае кроўныя, уласна зароблены.

— Давялося, як кажуць, круціцца самім?

— Так, самім. Калектыў наш дружны, згуртаваны. Гэта адна каманда, аб'яднаная высокай мэтай. Звычайна я не карыстаюся ўзвышанымі словамі, пахвальнымі эпітэтамі, але сёння, напэўна, не ўстрымаюся. Вы былі на мітынгу з нагоды адкрыцця абноўленага і мадэрнізаванага цэха па зборцы экскаватараў? Бачылі нашых двух прыгажуноў-асілкаў «DNEPR», агеньчыкі ў вачах працаўнікоў за вынікі сваёй ударнай работы, радасць іх? Гэта, маўляў, не чыя-небудзь, а менавіта наша работа. Дык як тут не ганарыцца!

— Хочаце назваць тых працаўнікоў, якія ўнеслі асабліва вялікі ўклад у новую справу?

— *(На хвілінку задумаўся.)* У калектыве каля пяцісот чалавек. Пералічыць усіх лепшых проста немагчыма. Але няхай не крыўдзяцца іншыя, калі я назаву начальніка тэхнічнага аддзела Аляксандра Іванавіча Казлова і начальніка цэха № 3 па зборцы экскаватараў Вячаслава Мікалаевіча Смарцава.

— Ігар Кірылавіч, на заводзе вас называюць татам экскаватараў, так што не прыніжайце сваю асабістую ролю ў новай справе. Начальнік аддзела ідэалагічнай і кадравай работы Валерый Мароз, ды і не толькі ён, напрыклад, адзначылі вялікую арганізацыйную і выхаваўчую работу на ўсіх этапах падрыхтоўкі вытворчасці менавіта дырэктара...

— *(Усміхаецца.)* Дзякуй, што не забылі. А калі сур'ёзна, дык стараўся як след выконваць свае абавязкі кіраўніка, не адстаць ад іншых.

— І ўсё ж, як з'явілася ідэя арганізаваць выпуск новай тэхнікі?

— Завод мае ўласнае канструктарскае бюро, кваліфікацыя спецыялістаў вельмі высокая, мы выкарыстоўваем перадавыя канструктарскія праграмы, наладзілі надзейны тэхналагічны працэс, добра арганізавалі вытворчасць і ніколі не падводзілі сваіх партнёраў. Пасля развалу Савецкага Саюза нам цяжка, а то і зусім немагчыма было спланаваць уласныя работы па рамонце тэхнікі старонніх арганізацый, таму пачалі выпускаць новыя запчасткі для экскаватараў. І калі справа пайшла, гэты кірунак вырашылі змяніць: а чаму б самім не наладзіць вытворчасць экскаватараў? Так, у 2009 годзе ў нас з'явіўся першы праект зборкі экскаватара з нямецка-кітайскіх камплектуючых, у якім толькі 10 працэнтаў было нашых дэталяў. Машына з'явілася ў 2011 годзе.

— А што сёння?

— За два гады мы цалкам выраблі канструктарскую дакументацыю на новы, свой ужо, экзэмпляр.

Не горш за сусветныя ўзоры

— І які ж працэнт складнікаў беларускіх у ім зараз?

— 67 працэнтаў. Коўш, цялежка гусенічная, гідраўлічны і паліўны бак, страла, рама, кабіна, капот правы і верхні, цэнтральны калектар, рукаў гідраўлічны і іншае — нашай заводскай вытворчасці. Супрацьвага — гомельскага завода «Цэнтраліт», сядзенне гідраўлічнае — закрытага акцыянернага таварыства «Сібека» (Беларусь). Па кааперацыі мы працуем таксама з такімі айчыннымі прадпрыемствамі, як МАЗ, МТЗ, Асіповіцкі завод аўтамабільных агрэгатаў, Мінскім вытворчым аб'яднаннем вылічальнай тэхнікі і г. д.

— А што ў экскаватары іншаземнага?

— Дызельны рухавік Deutz і гідраўлічная сістэма сусветна вядомай нямецкай фірмы BOSH Rexroth.

— Якія арыенціры ставіў перад сабой калектыў, пачынаючы новую справу?

— Каб экскаватар быў надзейным у эксплуатацыі, бяспечным па экалагічных параметрах, канкурэнтаздольным, прымальным па цане ў параўнанні з аналагамі іншых краін. Дарэчы, наша "нованароджанае дзіця" на 100-150 мільёнаў рублёў танней за сваіх замежных аналагаў. Заказы на іх ёсць.

Адным словам, за экскаватарамі — наша будучыня. Яны не горшыя за сусветныя аналагі, і, як кажуць, павінны заваяваць сваё месца пад сонцам, стаць нашай стабільнай прадукцыяй.

Мы не спыняемся на адной мадэлі экскаватара, а працуем над мадэллю яго «брата» — экскаватара на колавым ходзе. Фактычна ўсе вузлы яго ўзгоднены і адаптаваны. Не за гарамі вытворчасць іх і выпрабаванні.

— Мы разумеем, Ігар Кірылавіч, гордасць калектыву за зроблены. Поспеху, перамозе трэба радавацца — і гэта правільна. А ці засталося ў вас у душы нейкая незадаволенасць тым, што, скажам, недзе нешта ўпусцілі, недагледзелі, недадумалі?

— Вырашаючы звычайна адну задачу, на парадку дня паўстае ўжо другая праблема, з якой трэба справіцца. Каб запусціць у работу цэх № 3 па зборцы экскаватараў, нашы спецыялісты пабывалі ў Кітаі, Расіі, Германіі, Італіі з тым, каб выкарыстаць вопыт іх заводаў, пераняць лепшае, ўкараніць новыя тэхнічныя навінкі ў сябе.

Напрыклад, на сусветнай будаўнічай выставе ў Германіі, якая праходзіць адзін раз у тры гады, мы намецілі тое, над чым трэба нам працаваць па экскаватарнай тэматыцы, да чаго імкнуцца: палепшыць электрычны складнік і ўмовы работы машыніста экскаватара (камп'ютар, сістэма навігацыі, камера агляду задняга віду).

Гэта па-першае. Па-другое. Наш экскаватар, працуе ўжо на аб'ектах «Гомельпрамбуда», і яго спецыялісты падказалі нам, што ў наступных машынах пажадана змяніць, папраўіць, на чым у далейшым засяродзіць увагу. І мы гэта зрабілі на двух экскаватарах. Я ўсё гэта для таго сказаў, што незадаволенасці сваёй работай у цэлым у нас няма. Былі і ёсць пэўныя сумненні, і, вядома ж, без памылак не абыходзілася. Аднак усё гэта перакрывае канчатковы вынік.

— Як гаворыцца, спакой нам толькі сніцца...

— Правільна сказана. Як і тое, што самазаспакаенне — тормаз у развіцці. Адна з задач заключаецца ў тым, каб арганізаваць навучанне тых людзей, якія будуць працаваць на экскаватарах, каб абслугоўванне тэхнікі як у гарантыйныя, так і паслягарантыйныя тэрміны праходзіла на належным узроўні. Пытанне адкрыцця такіх курсаў узгадняецца з Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва і будаўнічым цэнтрам рэспублікі.

Вось яны, магутныя «дзеткі» завода — экскаватары серыі ET 2301.

Якасць і надзейнасць

Гэта — галоўнае ў дзейнасці калектыву. Для чаго многае ўжо зроблена і многае робіцца. Сваё месца тут займае акрэдытаваная лабараторыя неразбуральнага кантролю на правядзенне ўльтрагукавой дэфекталогіі, візуальна-аптычнага кантролю, механічных выпрабаванняў, асноўнага металу і зварных злучэнняў.

Сістэма менеджменту якасці прайшла сертыфікацыю на прадмет адпаведнасці патрабаванняў СТБ ISO 9001-2009 і Маскоўскай сістэмы дабравольнай сертыфікацыі ў будаўніцтве «Мостбудсертыфікавання».

УНП 400075771

Першаадкрывальнікі

Начальнік тэхнічнага аддзела Аляксандр КАЗЛОЎ і начальнік цэха № 3 па зборцы экскаватараў Вячаслаў СМАРЦАЎ.

Мы сустрэліся з тымі кіраўнікамі, ад якіх у многім залежала арганізацыя новай справы і прозвішчы якіх назваў дырэктар як першаадкрывальнікаў, — начальнікам тэхнічнага аддзела Аляксандрам Казловым і начальнікам цэха № 3 па зборцы экскаватараў Вячаславам Смарцавым. Першы з іх пасля заканчэння Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі ўжо 15 гадоў працуе на заводзе, 12 з якіх аддаў канструктарскай рабоце, а ў другога працоўны стаж тут 22 гады, 20 з якіх ён быў майстрам па рамонце экскаватараў.

